

ЧАРАЎНІЦТВА ВЫГАНАШЧАНСКАГА ЗАКАЗНІКА

МС

НАВОШТА НАМ БЕРАГ ТУРЭЦКІ?



МС

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родной мове

# ЗВЯЗДА

15 МАЯ 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 93 (29207)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтрвыбаркама:**

*«Члены ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдатаў у прэзідэнты будуць збіраць подпісы з 21 мая да 19 чэрвеня ўключна. Падпісныя лісты правяраюцца 20 дзён. У перыяд з 5 да 14 ліпеня Цэнтральная камісія правядзе пасяджэнне, і тады народ даведаецца спісы кандыдатаў у прэзідэнты. Яны ўсе атрымаюць бясплатны эфірны час на тэлебачанні і радыё, газетную плошчу. Акрамя таго, ЦВК выпусціць інфармацыйныя буклеты з кароткімі біяграфічнымі звесткамі кожнага з кандыдатаў».*

# БЕЛАЦАРКОЎНЫЯ ЛЬВЫ



Белая Царква ў Чашніцкім раёне — адзіная ў нас вёска з такой назвай. Апошнім часам яе згадваюць у сувязі з правядзеннем этнафэстываляў, арніталагічных і рэлігійных экскурсій — на паўвостраве Чарэйскага возера знаходзяцца рэшткі праваслаўнага Траецкага храма ў атачэнні багатай прыроды. Не дзіўна, што ў вёсцы спыняецца шмат людзей, цікаўных да прыроды, культуры і гісторыі, а таму яна мяняе сваё аблічча. Вось і жыхар вёскі Юрый ВЕЦЯОРАЦ, які трыццаць гадоў працуе ў Новалукомлі кіроўцам, перад бацькоўскай сядзібай год таму ўсталяваў фігуры экзатычных для нас жывёл. Згадзіцеся, глядзіцца прыгожа, хоць і нязвыкла.

Гэты сюжэт я ўбачыў выпадкова, калі мінаў вёску. Спыніўся, пацікавіўся, зрабіў некалькі здымкаў Юрыя і яго жонкі Святланы, якія шчыравалі каля сваіх «гадаванцаў», паднаўляючы ім «масць».

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Латвія і Літва працягнулі тэрміны абмежаванняў пры перасячэнні граніцы. У Літве каранцінны рэжым падоўжаны да 24.00 31 мая, у Латвіі рэжым надзвычайнай сітуацыі — да 9 чэрвеня.**
- Міністры абароны Беларусі і Кітая абмеркавалі сумесную баявую падрыхтоўку і адукацыю.
- **Памерла Ала Мешчаракова, актрыса, якая сыграла ў фільмах «А зоркі тут ціхія» і «Ксенія, любімая жонка Фёдара».**



- Франтальныя пагрузчыкі БелАЗ адпраўленыя на Філіпіны.
- **XXI Міжнародная выстаўка «Вясна ў Гомелі» пройдзе з 25 мая да 10 чэрвеня ў віртуальным фармаце.**

ISSN 1990 - 763X
20093

На слыху

## ПЕРАКЛАДЫ З МОВЫ ПОЗІРКАЎ...



Санітарка — Новікава В. А., медсястра — Аляксейкава С. І., урач — Жарына В. А., лабарант — Дзёміна Т. А, памочнік урача — Лагодзіч Т. Ю.

**Пра неабходнасць псіхалагічнай падтрымкі, пра тыл, перадавую і простыя жаночыя мары медыкаў з невялікага райцэнтра Буда-Кашалёва на Гомельшчыне, якія цяпер працуюць з небяспечнай інфекцыяй...**

СТАР. 4

Камунальныя стасункі

## ДАДАТКОВАЯ АДКАЗНАСЦЬ

### Як раённыя службы ЖКГ змагаюцца з вірусам

**Пандэмія каранавіруса вельмі паўплывала на наша звычайнае жыццё, і самым розным структурам давялося ўнесці пэўныя карэкціроўкі ў сваю работу. Пры гэтым на многіх з іх, не толькі на медыкаў, ляглі дадатковая адказнасць і нагрузка. Мы даведаліся, як у розных раённых цэнтрах краіны камунальнікі змагаюцца з вірусам і ахоўваюць здароўе грамадзян.**

### Віцебшчына

Супрацоўнікі жыллёва-камунальнай гаспадаркі Лепеля праводзяць дэзынфекцыю вулічна-дарожнай сеткі, дваровых тэрыторый і пад'ездаў жылых дамоў. Сродкі, якія пры гэтым выкарыстоўваюцца, узгоднены з Віцебскім абласным цэнтрам гігіены і эпідэміялогіі.

— Для гэтага быў распрацаваны план апрацоўкі аб'ектаў, і работа ў такім кірунку ідзе ўжо не адзін тыдзень, — адзначае **дырэктар КУВП «Бароўка» Аляксандр АКСЯНОВІЧ.** — Напрыклад, адзін раз на суткі спецыяльнымі растворамі апрацоўваюцца прыпынкі грамадскага транспарту, урны, лаўкі, поручні, дзіцячае і спартыўнае абсталяванне.

Вулічна-дарожную сетку, у тым ліку тратуары і прыдамавыя тэрыторыі, апрацоўваюць звычайна ў 5-6 гадзін раніцы. Для гэтага спецыялісты ЖКГ выкарыстоўваюць дэзынфіцыруючы сродак «Хлордэз» (кожны дзень яго ідзе каля пяці тон), які распыляюць з дапамогай спецыяльнай тэхнікі. Раствор для апрацоўкі гатуюць яшчэ напярэдадні вечарам: у вадзе раствараюць хлоразмяшчальныя таблеткі.

СТАР. 3

# Асноўныя тэндэнцыі, практычныя пытанні

## Прэзідэнт заслухаў даклад прэм'ер-міністра пра работу эканомікі

**Рабочая сустрэча адбылася ўчора ў Палацы Незалежнасці. Сярод тэм нарады — сітуацыя з дзярждоўгам, інвестыцыі міжнародных банкаўскіх структур і цэны на прыродны газ. Перш за ўсё Прэзідэнт пацікавіўся станам эканомікі краіны па выніках чатырох месяцаў бягучага года. Асаблівы акцэнт кіраўнік дзяржавы зрабіў на «тэндэнцыях, якія павінны нас насцярожваць і насцярожваюць».**

Сярод пытанняў, якія абмеркавалі на сустрэчы, — супрацоўніцтва з Міжнародным валютным фондам і з іншымі банкаўскімі міжнароднымі арганізацыямі, якія не супраць нас прафінансаваць у гэты час, у тым ліку і па ахове здароўя.

Звярнуў Прэзідэнт увагу на яшчэ адзін аспект, які назваў «практычным пытаннем, вельмі важным». Па яго інфармацыі, Расія прадае прыродны газ Еўропе па цэнах да 70 долараў (за тысячу кубаметраў): «65-68 долараў, але ніяк не 127, як для Беларусі. Якая тут сітуацыя, абстаноўка, на што мы можам разлічваць у будучым? Я гэтае пытанне завастраў, вы памятаеце, на відэаканферэнцыі ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза. У найбліжэйшы час у нас таксама адбудзецца ўжо такім жа фармаце канферэнцыя, і хацелася б ведаць, што на сёння зроблена па зніжэнні цаны на прыродны газ для Беларусі».

### Пункты ўстойлівасці

Сяргей Румас пачаў свой даклад з таго, што нагадаў: два дні таму адбылося пасяджэнне ўрада, дзе падрабязна разглядзелі работу розных сектараў эканомікі ў складаных умовах.

Пасля ўжо ў размове з журналістамі Сяргей Румас адзначыў, што як драйверы росту за чатыры месяцы вызначыліся сельская гаспадарка, будаўніцтва, а ў сферы паслуг — IT-галіна. Іншыя сферы ў пэўнай ступені былі закрануты крызіснымі з'явамі з-за пандэміі.

«Прамысловасць знізіла тэмпы на адзін працэнт, таксама сярод найбольш пацярпелых — грамадскае харчаванне, турыстычная галіна, крыху знізіўся рознічны тавараабарот. Але ўсе гэтыя падзенні былі спрагназаваныя ўрадам», — паведаміў прэм'ер-міністр.

Па яго словах, урад разлічвае, што з ліпеня эканоміка ў пацярпелых галінах пачне наганяць і дабаўляць. Ад прамысловасці росту чакаюць з чэрвеня.

Прэзідэнт вярнуў ва ўрад другі пакет мер падтрымкі эканомікі. «Патрабаванне кіраўніка краіны — каб ніякая падтрымка на месцах не распаўсюджвалася без удзелу мясцовых органаў улады. Таму мы бачым, як дапрацаваць гэты пакет мер падтрымкі, і, сапраўды, гэта сумленная заўвага. Губернатары гатовыя ўзначаліць гэту работу і, адпаведна, несці адказнасць за гэтыя вынікі, бо яны лепш бачаць, якія прадпрыемствы і сектары маюць патрэбу ў падтрымцы», — падкрэсліў Сяргей Румас і выказаў думку, што ў пачатку наступнага тыдня дапрацаваны дакумент будзе ўнесены ў Адміністрацыю Прэзідэнта.

У другім пакеце змешчаны мерапрыемствы па падтрымцы канкрэтных катэгорый людзей. Урад прапанаваў тым, хто працуе ва ўмовах няпоўнай занятасці і ў каго заробкі аказаліся меншыя за мінімальныя, за кошт бюджэту зрабіць даплату.

Нязменным застанецца патрабаванне Прэзідэнта захаваць працоўныя калектывы і праз гэта жыццяздольнасць прадпрыемстваў, паўтарыў прэм'ер. Тады, калі адкрыюцца рынкі, мы будзем гатовыя задаволіць патрэбы ў прадукцыі.

За чатыры месяцы рэспубліканскі і мясцовыя бюджэты выкананы з прафіцытам. У абодвух выпадках ён складае 600 мільёнаў рублёў. «Гэта сведчыць пра тое, што расходы і даходы бюджэтаў збалансаваныя. Сёння Рэспубліка Беларусь поўнасцю і ў тэрмін разлічваецца па ўсіх знешніх пазыках. Адзінае — змяніцца структура гэтых пазык. Мы больш разлічвалі на прыцягненне сродкаў ад размяшчэння еўрааблігацый, але сёння сітуацыя на рынках капіталу не такая спрыяльная, — дадаў Сяргей Румас. — Але ў нас ёсць іншыя крыніцы, і ўсе абавязкі краіны, якія прыходзяцца на пагашэнне ў 2020 годзе, будуць выкананы безумоўна і ў тэрмін».

Што да крэдыту МВФ, то, як расказаў Сяргей Румас, цяпер ідзе работа з дакументамі.

«На тэрмінах пакуль не магу сказаць, але тое, што ўсе перагаворшчыкі знаходзяцца ў пастаянным кантакце, зразумела, дыстанцыйным ва ўмовах пандэміі, — гэта я магу падцвердзіць. І тут у нас усё рухаецца пазітыўна», — запэўніў беларускі прэм'ер.

### Спадзяванне на справядлівасць

На пытанне журналістаў, ці збіраецца беларускі ўрад весці перагаворы з расійскім бокам аб меншых цэнах на газ, прэм'ер-міністр удакладніў, што размова не пра тое, каб плаціць менш, а пра тое, каб плата была справядлівая.

«Мы хацелі б плаціць за газ па справядлівым кошце, не «менш». І сёння ў нас ёсць усе падставы паказаць на лічбах, што цана 127 (долараў за тысячу кубаметраў). — **«Зв.»**) — яна па даходнасці для Газпрама перавышае даходнасць яго паставак у краіны дальняга замежжа, — адказаў Сяргей Румас. — Мы сёння нават кажам пра тое, што беларусы не хочуць ніякай «ільготнай» цаны. Беларусы не хочуць ніякай «расійскай» цаны. Беларусы хочуць справядлівую цану па сутнасці, якая забяспечвае даходнасць для Газпрама такую ж, як пастаўкі ў іншыя краіны».

У цане, пра якую ідзе размова, няма ніякай «інтэграцыйнай» скідкі ні ў Саюзнай дзяржаве, ні ў ЕАЭС, расплумачыў прэм'ер.

«Спотавыя пастаўкі праходзяць па цане 80 долараў за тысячу кубаметраў. Сапраўды, сёння цэны ў параўнанні з тымі, калі мы адпрацоўвалі гэты кантракт у канцы 2019 года, значна ўпалі, і я спадзяюся, што гэтыя нашы аргументы будуць пачутыя расійскім бокам», — дадаў Сяргей Румас.

Ён праінфармаваў, што на май запланаваны поўнафарматныя перагаворы Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Сямашкі з кіраўніцтвам Газпрама.

«Я лічу, што ў нас вялікія шанцы дамовіцца пра справядлівую цану на газ для Рэспублікі Беларусь на 2020 год», — падзяліўся прэм'ер.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, Марыя ДАДАЛКА.**

---

З першых вуснаў

# «НІЯКІХ НЕПАТРЭБНЫХ ПАСЛАБЛЕННЯЎ БЫЦЬ НЕ ПАВІННА»

**Аб актуальных для сістэмы адукацыі пытаннях Прэзідэнту Беларусі далажылі міністр адукацыі Ігар Карпенка і намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка.**



Фота БелТА.

### Глядзець па сабе

«Ніякія праблемы ў эканоміцы і ніякія вірусы тым больш не адмяняюць актуальныя праблемы, якія заключаюцца ў нашых адносінах да дзяцей, — такімі словамі распачаў даклад кіраўнік дзяржавы. — Таму на парадку дня заканчэнне навучальнага года ў сістэме адукацыі, вядома, уступная кампанія і летняе аздараўленне, адпачынак дзяцей».

Зыходзіць трэба з таго, як развівалася сітуацыя ў Беларусі і якія меры прымаліся кіраўніцтвам краіны ў сувязі з эпідэміялагічнай абстаноўкай, падкрэсліў Прэзідэнт.

«Рашэнні будуць зыходзіць выключна з таго, як развіваліся гэтыя падзеі, а не так, як робяць нашы суседзі, — звярнуў ён увагу. — Мы нічога не забаранялі, мы адкрыта і шчыра казалі людзям, як трэба жыць і працаваць, таму з гэтага будзем зыходзіць. Ніякіх непатрэбных паслабленняў быць не павінна».

Для таго каб вучыцца ў ВНУ, патрэбны веды, дадаў Прэзідэнт.

«Калі гэта школа, давайце вызначымся, як будзем праводзіць там выпускныя экзамены па заканчэнні 9 і 11 класаў. Я гатовы выслухаць вашы прапановы для прыняцця адпаведнага рашэння», — звярнуўся да дакладчыкаў Аляксандр Лукашэнка.

Чацвёртая чвэрць пачалася сёлета 20 красавіка. З 1 015 600 вучняў, якія ёсць у краіне, у школах прысутнічае каля 41 працэнта, паведаміў Прэзідэнту міністр адукацыі Ігар Карпенка.

«Па-рознаму развіваюцца падзеі ў розных рэгіёнах. У сельскай мясцовасці значна больш школьнікаў на занятках. У Мінску — гэта прыкладна 27—28 працэнтаў. Адпаведна, мы выбудоўваем адукацыйны працэс такім чынам, каб не страціць якасць адукацыі», — дадаў ён.

### ЦТ пачнецца 25 чэрвеня

Пра гэта Ігар Карпенка паведаміў журналістам па выніках нарады ў Прэзідэнта.

«Гэта не значыць, што ў нас не будзе запасу часу, каб падрыхтавацца да пачатку новага навучальнага года, — сказаў ён. — Мы якраз укладаемся ва ўсе тэрміны правядзення кампаніі, уключаючы момант падачы дакументаў і залічэння ў вышэйшыя навучальныя ўстановы на бюджэт, на платнае навучанне, паступленне ў сярэднія спецыяльныя, прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы».

Сёлета лічбы прыёму ў ВНУ ў параўнанні з мінулым годам павялічаны за кошт тэхнічных, тэхналагічных, медыцынскіх, фізкультурна-аздараўленчых спецыяльнасцяў.

«Трошкі павялічаны набор і ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, — дадаў Ігар Карпенка. — Ну а ў сістэме прафтэхадукацыі ў нас гнуткі набор: мы ў працэсе прыёму дакументаў можам лічбы скарэкціраваць, каб ніводнае дзіця, якое не паступіць у сярэднюю спецыяльную альбо вышэйшую навучальную ўстанову, не засталося за бортам па засваенні тых ці іншых прафесій».

Навучальны год будзе скончаны ва ўстаноўленыя тэрміны — 30 мая, паведаміў міністр.

«Потым правядзём выпускныя экзамены. Падкарэкціруем, магчыма, графік іх правядзення, пагладзім змест. Прымем меры перасцярогі, якія рэкамендуе Міністэрства аховы здароўя», — запэўніў кіраўнік ведамства.

### Балі — па канкрэтнай сітуацыі

Што датычыцца Рэспубліканскага балю выпускнікоў, то Міністэрства адукацыі ўнесла кіраўніку дзяржавы прапанову яго правесці.

«Думаю, у найбліжэйшы час будуць адпрацаваны канкрэтная дата і канкрэтны фармат гэтага мерапрыемства», — выказаў меркаванне міністр.

Разам з тым рэспубліканскі «Апошні званок» у Бабруйску, напрыклад, вырашана адмяніць.

«Тут трэба зыходзіць з таго, які гэта рэгіён, якая ўстанова адукацыі, якая там складваецца сітуацыя, бо ўсюды ўсё па-рознаму, — растлумачыў міністр пазіцыю ведамства адносна правядзення выпускных баляў. — Мы дамовіліся пра тое, што ўсё ж такі ва ўрачыстай абстаноўцы атэстаты павінны быць уручаныя. Напэўна, кожная канкрэтная школа разам з бацькамі павінна вызначыцца, у якім фармаце яны гэта правядуць».

Міністэрства, па словах Карпенкі, не збіраецца ў гэтых пытаннях абмяжоўваць школы.

### Школьныя лагеры — з 1 чэрвеня, аздараўленчыя — з 15-га

З 1—2 чэрвеня школы па заяўках бацькоў прапануюць лагеры дзённага знаходжання дзяцей.

Завяршаюцца работы па падрыхтоўцы лагераў з кругласутачным рэжымам знаходжання для прыёму дзяцей. Сёлета плануецца аздаравіць больш за 408 тысяч школьнікаў, што на 10 тысяч больш, чым летась. Летнія аздараўленчыя лагеры з кругласутачным знаходжаннем дзяцей будуць адкрыты з 15 чэрвеня.

### Для паступлення замежнікаў няма праблем

Ігар Карпенка не бачыць праблемы па наборы замежных абітурыентаў сёлета: тэрміны прыняцця ад іх дакументаў доўжацца да снежня, да таго ж многія краіны пачынаюць ужо адкрывацца.

«Сёння вышэйшыя навучальныя ўстановы пачынаюць работу па камунікацыі анлайн з патэнцыйнымі замежнымі абітурыентамі па мовах навучання, — паведаміў міністр адукацыі. — Гэта схема не новая, яна працавала і летась, і пазалетась. Мы выпусцім сёлета каля пяці тысяч замежных студэнтаў сістэмы вышэйшай адукацыі. Каля 300 з іх, па нашых звестках, збіраецца паступаць у аспірантуру, магістратуру. Прыкладна 60 застанецца ў нас працаваць».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

---

Блізкая ўлада

# ВЕРТЫКАЛЬ ДАВЕРУ

**Традыцыйна па суботах аблвыканкамам і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя лініі ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, папяратворчасці, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 16 мая, з 9.00 да 12.00 праводзяць:

• намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

• кіраўнік спраў Гомельскага аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Іван Алёйзавіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;

• намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслан Віктаравіч ПАРХАМОВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

• старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Юрый Уладзіміравіч ТРУШЧАНКА. Тэл. 8 017 222 44 44.

---

Выбары-2020

# Ініцыятыўныя групы падалі заявы

**Па стане на раніцу 14 мая было пададзена 14 заяў аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдатаў у прэзідэнты. Такая інфармацыя размешчана на сайце ЦВК, паведамляе БелТА.**

Прэтэндэнт на пасаду Прэзідэнта павінен не пазней за 15 мая падаць у ЦВК дакументы, неабходныя для рэгістрацыі ініцыятыўнай групы. Яе члены з 21 мая да 19 чэрвеня змогуць збіраць подпісы ў падтрымку вылучэння свайго кандыдата. Вылучэнне кандыдатаў пройдзе з 20 чэрвеня да 4 ліпеня, рэгістрацыя — з 5 да 14 ліпеня. Датэрміновае галасаванне на выбарах адбудзецца з 4 да 8 жніўня. Асноўны дзень галасавання — 9 жніўня.

Сярод тых, хто падаў заяву аб рэгістрацыі ініцыятыўнай групы, дзеючы Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Яе ўзначальвае старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Міхаіл Орда.

# ДАДАТКОВАЯ АДКАЗНАСЦЬ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прыпынкі, урны, лаўкі, дзіцячае і спартыўнае абсталяванне апрацоўваюць з 8 да 11 гадзін раніцы спецыяльным растворам з мыйным эфектам «Беладэз-М».

— Гэты сродак мае даказаную эфектыўнасць супраць вірусаў і з'яўляецца бяспечным для людзей, жывёл і раслін, — тлумачыць Аляксандр Уладзіміравіч. — І праз 20-30 хвілін пасля апрацоўкі ўжо можна смела гуляць на той жа дзіцячай пляцоўцы.

Але вельмі важна, каб гэтым мерапрыемствам спрыяла і надвор'е — у дождж апрацоўку грамадскіх месцаў на вуліцы не праводзяць. Аднак пад'ездаў жылых дамоў гэта не датычыцца. Там таксама пачалі часцей рабіць прыборку і выкарыстоўваць пры гэтым дэзынфіцыруючыя сродкі: камунальнікі апрацоўваюць дамафоны, ручкі, поручні і выключальнікі.

Такія ж работы праводзяць у вёсках і аграгарадках — графікі размяшчаюць на дошках аб'яў. Пры гэтым спецыялісты працуюць толькі ў індывідуальных сродках абароны, каб выключыць негатыўны ўплыў.

## Брэстчына

У Бярозе апрацоўка вулічна-дарожнай сеткі праводзіцца ноччу — для гэтага таксама выкарыстоўваюць дазволеныя дэзынфіцыруючыя сродкі і распыляюць іх з дапамогай спецыяльнай тэхнікі. Прыпынкі гарадскога транспарту таксама апрацоўваюць кожную ноч, а дзіцячыя пляцоўкі, лаўкі на прыдамавых тэрыторыях і пад'езды жылых дамоў — згодна з графікам прыборкі пад'ездаў таго ці іншага жылога сектара. Для іх апрацоўкі ўжо выкарыстоўваюць іншыя сродкі, якія выпускаюць ЗАТ «БелАсептыка» і ВТУП «Інкраслаў».

— Пакуль дэзынфекцыю мы праводзім за кошт уласных сродкаў прадпрыемства, але ў найбліжэйшы час нам павінны аказаць дапамогу і з боку Бярозаўскага райвыканкама, — адзначае **намеснік дырэктара ДУВП «Бярозаўская ЖКГ» Дзяніс ДАВІДОВІЧ.** — Што ж датычыцца аховы здароўя нашых спецыялістаў, то ўвесь персанал забяспечаны сродкамі індывідуальнай аховы. Мы арганізавалі вытворчасць масак, таму іх недахопу не адчуваем.

Маскі, як і антысептыкі для рук, можна ўбачыць на ўваходзе на прадпрыемства, у холах, прыёмных і санвузлах, у кабінетах і тэхнічных памяшканнях. Што ж датычыцца грамадзян, то іх доступ на прадпрыемства пакуль абмежавалі — усе пытанні цяпер вырашаюць праз тэлефон. Пры гэтым на тэрыторыі прадпрыемства можна знаходзіцца толькі ў масцы.

— Цяпер праход на тэрыторыю арганізаваны праз транспартную прахадную, каб адсачыць тых, хто не мае масак. Акрамя гэтага, кожную раніцу спецыялістам прадпрыемства мераюць тэмпературу з дапамогай бескантактавага тэрмометра, адменены ўсе масавыя зборы калектыву, і ўсе супрацоўнікі павінны трымацца дыстанцыі, — тлумачыць Дзяніс Васілевіч. — Па заяўках грамадзян спецыялісты працуюць у звычайным рэжыме, але пры гэтым яны павінны мець пры сабе СІА і захоўваць неабходную дыстанцыю.



## Міншчына

У Стоўбцах дэзынфекцыю вуліц і тратуараў робяць з дапамогай новай спецыялізаванай машыны МАЗ-КО-809. Звычайна супрацоўнікі ЖКГ праводзяць гэтыя мерапрыемствы познім вечарам праз дзень — менавіта такі графік работ устанавіў мясцовы райвыканкам. У асноўным камунальныя службы апрацоўваюць тыя вуліцы, дзе адзначаецца найбольш інтэнсіўны рух пешаходаў і аўтамабіляў. А для апрацоўкі месцаў грамадскага карыстання на прадпрыемствах створаны спецыяльныя брыгады. Раз на суткі яны абавязкова дэзынфіцыруюць прыпынкі грамадскага транспарту (якіх у Стоўбцах налічваецца 27), кожны дзень апрацоўваюць ад 250 да 350 пад'ездаў жылых дамоў і ў залежнасці ад графіку выконваюць такія ж работы на дзіцячых пляцоўках і абеззаражваюць малыя архітэктурныя формы.

— Усе растворы, якія мы выкарыстоўваем пры дэзынфекцыі, узгоднены з мясцовымі санітарнымі службамі, — адзначае **начальнік ЖЭУ УП «Стаўбцоўскае АКС» Генадзь ДОЎНАР.** — А ўсе работы мы пакуль выконваем за кошт сродкаў прадпрыемства, у тым ліку за іх жа купляем і сродкі індывідуальнай аховы для нашых спецыялістаў. Аднак мы ўжо абмяркоўваем з райвыканкамам магчымасць іх кампенсацыі з мясцовага бюджэту.

На самім жа прадпрыемстве спецыялісты прытрымліваюцца агульнапрынятых мер засцярогі — для правядзення дэзынфекцыі закуплены спецыяльныя касцюмы і плашчы, супрацоўнікі карыстаюцца маскамі, пальчаткамі і антысептыкамі. На заяўкі ад грамадзян камунальнікі таксама выязджаюць у сродках індывідуальнай аховы і абавязкова вытрымліваюць неабходную дыстанцыю.

**Валерыя КІСЛАЯ.**
**Фота газеты «Лепельскі край».**

## Рассадка ў цягніках па-ранейшаму сацыяльная

**Беларуская чыгунка падаўжае тэрмін дзеяння новай схемы рассаджвання ў цягніках з нумараванымі месцамі. Мера падоўжана да 15 чэрвеня ўключна, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі.**

Рассаджванне па новай схеме было ўведзена БЧ з 15 красавіка з мэтай захавання пасажырамі неабходнай сацыяльнай дыстанцыі ў купэйных, плацкартных вагонах і ў вагонах з месцамі для сядзення.

Гэтая мера скіравана на захаванне здароўя грамадзян, прафілактыку распаўсюджвання вірусных інфекцый сярод пасажыраў беларускай магістралі, а таксама стварэнне камфортных умоў праезду ў цягніках з нумараванымі месцамі.

Згодна з новай схемай рассаджвання, у купэйных вагонах размяшчаецца не больш за два пасажыры ў купэ, у плацкартных — не больш за тры ў адным адсеку. Для пасажыраў, якія афармілі праязныя дакументы ў адной замове, дазваляецца продаж і трох, і чатырох месцаў у купэ пры ўмове, што да гэтага ў тым купэ ніводнага месца не было прададзена.

Пры афармленні праязных дакументаў у вагоны з месцамі для сядзення схема рассаджвання пасажыраў залежыць ад іх канфігурацыі — 2 + 2 ці 3 + 2. У двухмесным радзе пасажыр займае месца каля акна, у трохмесным — адзін пасажыр каля акна, а другі — праз месца каля праходу (сярэдні рад застаецца вольным).

Новая схема рассаджвання прымяняецца пры афармленні праязных дакументаў як у чыгуначных касах, так і праз інтэрнэт.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## «ШЭНГЕН» ПАТАННЕЕ

**Еўрапарламент ухваліў пагадненне з Беларуссю аб спрашчэнні выдачы віз. Дакумент будзе накіраваны ў Савет Еўрасаюза для падпісання, пасля чаго Беларусь і ЕС змогуць абмяняцца ратыфікацыйнымі граматамі і такім чынам завяршыць працэдуру ратыфікацыі. Пагадненне ўступіць у сілу ў першы дзень другога месяца пасля гэтага — меркавалася, што ў чэрвені, аднак цяпер зразумела, што тэрміны зрушваюцца як мінімум на ліпень.**




## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Еўрасаюз бачыць у пандэміі магчымую пагрозу ваеннай бяспецы



З такой ацэнкай выступіў кіраўнік знешнепалітычнай службы ЕС Жазэп Борэль на анлайн-брыфінгу па выніках відэаканферэнцыі Савета ЕС на ўзроўні міністраў абароны. «Ваенная бяспека дзяржаў, якія развіваюцца, — і не толькі іх, а ўсяго свету — можа пацярпець у выніку пандэміі», — заявіў ён. Паводле слоў Борэля, у першую чаргу гэта датычыцца краін, якія залежаць ад продажу энергарэсурсаў і ўсіх астатніх відаў сыравіны, бо попыт на іх падае ва ўсім свеце. «Цяжкі ўдар будзе нанесены па рэгіёнах, якія залежаць ад турызму, у той жа час краіны Захаду не змогуць прымаць значную колькасць мігрантаў з праблемных дзяржаў у сувязі з пагаршэннем уласнага эканамічнага становішча, — адзначыў Жазэп Борэль. — Усё гэта прывядзе да сур'ёзных эканамічных праблем, якія могуць суправаджацца палітычнымі праблемамі».

### Apple адмовілася пакінуць супрацоўнікаў на аддаленай рабоце

Кампанія Apple планує адмовіцца ад рэжыму аддаленай работы, уведзенага ў сакавіку ў сувязі з пандэміяй каранавіруса, і паэтапна вярнуць супрацоўнікаў у офісы, у тым ліку ў штаб-кватэру Apple Park у Крэмніевай даліне. Пра гэта паведаміла Bloomberg са спасылкай на інфармаваныя крыніцы. Рашэнне Apple кантрастуе з падыходам іншых тэхналагічных гігантаў. У пачатку мая кіраўніцтва Google папярэдзіла супрацоўнікаў, што большасці з іх, хутчэй за ўсё, давядзецца працаваць у аддаленым рэжыме да канца года. Facebook таксама агучыла адпаведнае рашэнне. А генеральны дырэктар Twitter Джэк Дорсей дазволіў сваім супрацоўнікам застацца на аддаленай рабоце «хоць назаўжды».

### Канадскі заапарк верне двух пандаў у Кітай з-за недахопу бамбуку

Заапарк у Калгары адпраўляе дзвюх пандаў назад у Паднябесную раней за тэрмін па дагаворы аб арэндзе (жывёл маглі трымаць да 2023 года) з-за недахопу бамбуку. Пра гэта паведаміла CBC News. Супрацоўнікі беспаспяхова спрабавалі імпартаваць дастатковую яго колькасць, каб накарміць пандаў. «Гэта занадта моцны стрэс для маёй каманды і жывёл», — заўважыў прэзідэнт і генеральны дырэктар заапарка Клеман Ланцьер. Свежы бамбук складае амаль увесь рацыён панды. Дарослая жывёла можа з'ядаць каля 40 кілаграмаў у дзень. Да пандэміі расліну прывозілі два разы на тыдзень з Кітая, але цяпер прамыя рэйсы адменены. Па словах Ланцьера, абмежаванні прывялі да завозу няякаснага бамбуку, які панды адмаўляліся есці. Днямі ў заапарку раслічваюць атрымаць дазвол на перавозку пандаў на радзіму.

# ПЕРАКЛАДЫ З МОВЫ ПОЗІРКАЎ...

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Для **Таццяны БІРУКОВАЙ** суткі — катэгорыя не часавая: жыццёвая. Цяпер — асабліва. Яна **медыцынская сястра аддзялення анестэзіялогіі, рэанімацыі і інтэнсіўнай тэрапіі ў Буда-Кашалёўскай цэнтральнай раённай бальніцы.** Змена закончылася — час адпачыць, потым выходзіць на сувязь са сваякамі. Па тэлефоне адказвае і на мае пытанні:

— Больш за месяц не бачыла сваю дачушку — малой тры гадкі — і мужа. Калі ў аддзяленне сталі паступаць пацыенты з каранавіруснай інфекцыяй, прыняла прынцыповае рашэнне: з'ехала ад сям'і. Цяжка. Але апасенне, што магу захварэць і заразіць сваякоў, больш атрувала душу, — кажа Тацццяна.

Лічыць, што ёй пашанцавала: родныя — надзейны тыл, спраўляюцца без яе добра, таму тут, на перадавой, ёй і працаваць-змагацца спакайней. Яна згадвае, як прыйшла працаваць у Буда-Кашалёўскую райбальніцу на пачатку двухтысячных гадоў. Была аперацыйнай сястрой, а вось ужо сёмы год працуе ў рэанімацыі. На пытанне, як працуецца цяпер, лаканічна адказвае: «па-рознаму». Цяжкасць змены залежыць ад дынамікі стану пацыентаў.

Акрамя дзяжурстваў у сваім аддзяленні, Тацццяна не раз выручала калег-сястрычак: хтосьці на бальнічным, хтосьці ў адпачынку. Кожныя рукі на вагу золата:

— Я згаджалася на дадатковую работу, бо дома ж адна была, чаго сняшацца ў чатыры сцяны. Паспіш, перакусіш і зноў можна працаваць.

На пытанне пра надбаўку, што ўбачыла ў «разлікоўцы» з зарплатай, медсястра адказвае: безумоўна, гэта вялікая фінансавая падтрымка. Жанчына шчыра дзякуе ўсім неабыякавым людзям і кажа, што дзяўчаты-калегі таксама прасілі падзякаваць:

— У маім аддзяленні сем медсёстраў і санітарачкі. Я адкажу за сваіх калег: усе старанна працавалі, зладжана, без капрызаў, незадаволенасці. Усе згуртаваліся. Калі атрымалі надбаўку да звычайнай зарплаты, зразумела ж, былі задаволены.

Тацццяна прызнаецца, што калегі дзеляцца, хто куды хоча размеркаваць грошы. Пра тое ж я пытаю і яе. Сур'ёзны голас рэанімацыйнай медсястры лагаднее, на другім канцы провада адчуваецца ўсмешка. Кажа: даўно марыла купіць дачушцы вялікі добры дамашні басейн.

Яе цёзка, **Тацццяна ЛАГОДЗІЧ, — памочнік урача ў Буда-Кашалёўскай раённай паліклініцы.** У родныя мясціны вярнулася восем гадоў таму. Прыехала працаваць у раён пасля вучобы ў Мазыры.

— Калі пачалася ўся гэта сітуацыя з каранавірусам, мне даручылі работу ў каранцінным аддзяленні. У нас цяпер асобны ўваход, — расказвае жанчына. — Аддзяленне спецыяльна арганізавалі два месяцы таму. Мая задача як памочніка — весці даўрачэбны прыём.

Яна аглядае наведвальнікаў з тэмпературай, кашлем, з іншымі праявамі вострых рэспіраторных вірусных захворванняў. Галоўнае — ацаніць стан хворага: памераць ціск, тэмпературу, даць накіраванне на аналізы, рэнтген, калі патрэбна. Потым перанакіраваць да пэўнага ўрача, які нясе дзяжурства на прыёме пацыентаў.



Урач-інфекцыяніст — Вольга МАХАНАВА.

Апавядае, што першы час усе прызвычайваліся працаваць у ахоўных касцюмах і шчытках. Цяпер галоўнае: паспачуваць, падбадзёрыць, засцерагчы, прыструніць — позіркам. Гэта важна, бо ёй даводзіцца аказваць пацыентам і своеасаблівую псіхалагічную дапамогу:

— Многія, асабліва пажылыя людзі, у роспачы. Хвалююцца і самі кажуць, што нават звычайны кашаль цяпер выклікае паніку. З канца мінулага тыдня, праўда, у нашым аддзяленні наведвальнікаў стала менш. Быў час, асабліва пасля выхадных, — прымалі да 100 чалавек у дзень. Гэта людзі з ВРВІ, прастудамі, якія хацелі звярнуцца па кансультацыю да спецыялістаў. Неабходна было ацэньваць стан здароўя і размяжоўваць патокі хворых.

Тацццяна кажа, што ў іх паліклініцы, канешне, усе мараць пра адно — каб усё гэта хутчэй скончылася і нарэшце і пацыенты, і медыкі ўздыхнулі з палёгкай.

— Я таксама як спецыяліст амбулаторна-паліклінічнага звяна атрымала даплату за красавік, — расказвае Тацццяна Лагодзіч і не тоіць, што надбаўка роўная большай частцы яе заробку. Ёй вельмі прыемная такая ўвага. Радуецца і за лабарантаў, і за малодшы персанал.

**Урач-інфекцыяніст Буда-Кашалёўскай райбальніцы Вольга МАХАНАВА** ў інфекцыйным аддзяленні вядзе пацыентаў толькі з COVID-19. Дзень на нагах у супрацьчумным касцюме — выпрабаванне не для кволых:

— Прыйшла ў бальніцу 16 гадоў таму, працавала ўчастковым тэрапеўтам. Потым перавучылася на інфекцыяніста і пасля не шкадавала аб гэтым ніколі. Цяпер, канешне, работа вельмі напружаная: вяду пацыентаў у інфекцыйным аддзяленні, працую ў начныя змены, назіраю хворых з каранавіруснай інфекцыяй, калі неабходная мая кансультацыя ўрачу агульнай практыкі. Прымаю такіх пацыентаў у сваім аддзяленні і даю рэкамендацыі, накіроўваю на лячэнне.

Вольга Леанідаўна лічыць, што медыкам як людзям, якія могуць адэкватна ўзважыць, што рэальна небяспечна, а што не, у цяперашняй сітуацыі лягчэй у маральным плане. Звычайным людзям вельмі цяжка нават прыняць, што яны заразіліся каранавіруснай інфекцыяй ці ў іх пнеўманія. Многія ў адчаі. Таму штодня надзея толькі на тое, што хутка навала сціхне.

— Адразу буду казаць не за сябе, а за ўсіх калег. Бо ў крытычных абставінах усе адкрываюцца і праяўляюць сябе, — кажа Вольга Маханава. — Дык вось, людзі працуюць самаададдана, не за надбаўкі. Калі толькі пачалі абмяркоўваць магчымасць прыняцця ўказа аб стымуляванні супрацоўнікаў, многія былі ўпэўнены, што будуць прэміі. Але ведалі: цяпер цяжкі час для ўсёй медыцыны, не чакалі, што так хутка налічаць гэтыя грошы.

Урач-інфекцыяніст кажа: нягледзячы ні на што, калектыў адчуў унутраную падтрымку, спагаду і жаданне аблегчыць работу медыкам.

— Я, напрыклад, жыву не ў самім райцэнтры — за дзесяць кіламетраў ад яго. Кожны дзень дабірацца на работу вельмі нязручна, — шчыра кажа Вольга Леанідаўна. — Дык вось, вырашыла нарэшце набыць машыну, узяла крэдыт.

Жанчына расказвае і аб падтрымцы сваякоў. Жартуе:

— Сям'я інфекцыяніста добра вымуштравана. Дома ведаюць усе правілы апрацоўкі рэчаў, дэзынфекцыі і «табу».

Сама ўрач пастаянна кантралюе тэмпературу цела і кажа, што галоўнае — не панікаваць і не выпрабоўваць лёс абыякавым стаўленнем да мер перасцярогі ад віруса.

Між тым за мінулы месяц супрацоўнікі Буда-Кашалёўскай цэнтральнай раённай бальніцы атрымалі дадатковую матэрыяльную падтрымку на агульную суму амаль 122 660 рублёў.

— Надбаўку ў дадатак да асноўнай заработнай платы атрымалі работнікі, якія аказвалі дапамогу пацыентам з каранавіруснай інфекцыяй і асобам, аднесеным да кантактаў першага ўзроўню, — тлумачыць **галоўны ўрач медыцынскай установы Жанна ЕЎТУХОВА.** — Была створана камісія, у якую ўвайшлі адміністрацыя, эканамісты, загадчыкі аддзяленняў і райпаліклінікі, начмед, галоўныя мядсёстры. Дагэтуль кожны дзень у аддзяленнях складалі справаздачы — хто працаваў з гэтай катэгорыяй пацыентаў. Бухгалтэрыя яшчэ раз правярала звесткі, каб нікога не забыць.

Жанна Уладзіміраўна адзначае, што ўрачы, сярэдні, малодшы медперсанал і ўсе работнікі функцыянальнага звяна — задаволены. Зваротаў ці пытанняў па выплатах не паступіла. Асобна вырашылі заахвоціць і падтрымаць работнікаў бальніцы, якія не трапілі ў пералік спецыялістаў згодна з указам, але актыўна дапамагалі ў наладжванні бытавых умоў у палатах. Такім людзям выпісалі прэмію з зарплатнага фонду ўстановы.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота дасланы гераінямі.**

## Мовай лічбаў

**На 14 мая ў краіне зарэгістравана 26 772 чалавекі з каранавіруснай інфекцыяй. З іх 8168 папраравіліся і выпісаны, 151 пацыент памёр. За суткі прырост склаў 947 новых выпадкаў, 457 — тых, хто папраравіўся, пяць чалавек выратаваць не ўдалося. За час распаўсюджвання COVID-19 у Беларусі выканана 308 156 тэстаў.**

Надвор'е

# Як быццам і не май...

**У гэтыя дні ў нас трымаецца фон сярэднясутачных тэмператур, на 3—8 градусаў ніжэйшы за кліматычную норму**

**У найбліжэйшыя трое сутак істотных змяненняў у характары надвор'я не адбудзецца, даюць несуцяшальны прагноз спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Тэрыторыя краіны па-ранейшаму застанецца ва ўладзе халодных паветраных мас, якія рухаюцца да нас з боку паўночнага захаду Еўропы. Тэмпературны фон захаваецца паніжаны, а па начах будуць адзначацца замаразкі. І калі ў пятніцу не будзе істотных ападкаў, то далей краіну чакае сапсаванае надвор'е.

У суботу да нас занясе няўстойлівыя паветраныя масы, якія паступаюць з Балтыйскага мора. Уначы ў паўночных раёнах, а ўдзень месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Удзень у асобных раёнах па поўначы краіны чакаецца моцны парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 1 да плюс 6 градусаў, але месцамі прагназуюцца замаразкі да 3 марозу. А вось удзень будзе аднosна камфортна — у дыяпазоне 11—18 цяпла.

Наша краіна будзе знаходзіцца пад уплывам малаактыўнага атмасфернага фронту і ў нядзелю. У гэты дзень працягнецца паступленне няўстойлівай паветранай масы з Балтыйскага мора. Уначы па поўначы, а ўдзень месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах, у асноўным па поўначы, чакаецца моцны парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 1 да плюс 7 градусаў, месцамі прагназуюцца замаразкі да мінус 2 градусаў. Удзень будзе ад плюс 9 градусаў па поўначы да 18 цяпла па поўдні краіны.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня атмасферныя франты, якія ссоўваюцца з Балтыйскага мора, будуць вызначаць у краіне няўстойлівае надвор'е з дажджамі і паніжаным тэмпературным фонам. У панядзелак уначы па паўночным захадзе, а ўдзень месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах магчыма ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—8 цяпла. Удзень будзе ад плюс 9 да плюс 16 градусаў, а па паўднёвым усходзе краіны — да 20 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Культасвета

# Кнігазнаўчыя чытанні — у анлайн-фармаце

**XVI Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні, прымеркаваныя да 500-годдзя заснавання Жыровіцкага манастыра і бібліятэкі, упершыню пройдуць у анлайн-фармаце. Відэатрансляцыя форуму ў рэжыме рэальнага часу пачнецца сёння, 15 мая, аб 11 гадзіне, а пазней відэазапіс канферэнцыі будзе дасяжны для ўсіх ахвотных.**

«Мы не змаглі адмяніць традыцыю штогадовага правядзення гэтай ужо слаўнай навуковай канферэнцыі, і хоць па зразумелых прычынах юбілей у Жыровіцах пакуль не адбудзецца, але хай наша міжнародная канферэнцыя стане своеасаблівым паклонам духоўнаму цэнтру Беларусі», — зазначаюць супрацоўнікі Нацыянальнай бібліятэкі, на заклік якой адгукнуліся навукоўцы як з нашай краіны, так і даследчыкі з Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны і Францыі. На інтэрнэт-партале nlb.by было зарэгістравана больш за 100 дакладаў, а каля 60 артыкулаў прадстаўлены для друку ў выніковым зборніку матэрыялаў канферэнцыі.

— Планавалі перанесці кнігазнаўчыя чытанні на восень, разглядалі розныя варыянты і шмат абмяркоўвалі гэта пытанне з патэнцыйнымі ўдзельнікамі, і аказалася, што наўрад ці ў лістападзе мы здолелі б сабраццца ў тым складзе, які быў заяўлены першапачаткова, — зазначае **намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Алесь СУША.** — Многія замежныя даследчыкі планавалі сваю работу вельмі загадзя, і яны проста не змаглі б прыехаць у іншыя даты. З іншага боку, не хацелася парушаць традыцыю правядзення канферэнцыі штогод у красавіку—маі, і прапускаць такую важную, вартую ўшанавання нагоду, як 500-гадовы юбілей Жыровіцкага манастыра і 550-годдзе цудатворнага абраза Божай Маці Жыровіцкай.

Замест публічнага мерапрыемства арганізатары распрацавалі надзвычай цікавую камбінаваную форму яго правядзення, якая спалучыць віртуальную частку і жывую прысутнасць. Так, каля 15 айчынных навукоўцаў, хто мае такую магчымасць, прыедуць у Нацыянальную бібліятэку, кожны ў дакладна вызначаны час, і агучаць свае даклады перад камерай — у анлайн-трансляцыі, у тым ліку на YouTube-канале. Да таго ж выступоўцам можна будзе задаваць пытанні ў інтэрнэт-каментарыях, і ў рэжыме рэальнага часу навукоўцы з дапамогай мадэратараў канферэнцыі паспрабуюць на іх адказаць. Частка ўдзельнікаў, якія не змогуць фізічна прысутнічаць на канферэнцыі, даслалі свае відэапрывітанні і запісы выступленняў, альбо суправадзілі гатовыя прэзентацыі аўдыякаментарыямі — усе гэтыя запісы будуць інтэграваныя ў агульную канву форуму. У прыватнасці, свае вітанні ўдзельнікам праз відэасувязь перададуць суарганізатары канферэнцыі — міністр культуры Юрый Бондар і прарэктар па навуковай рабоце Мінскай духоўнай семінарыі і духоўнай акадэміі Аляксандр Слесараў.

І, безумоўна, самыя цікавыя даследаванні на тэму гісторыі Жыровіцкага манастыра і бібліятэкі, развіцця кніжнай культуры Беларусі ўвайшлі ў зборнік матэрыялаў XVI Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў, які ўбачыць свет акурат да юбілею ў знак ушанавання адной з галоўных хрысціянскіх святынь.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**




## СУСТРЭЧА З БАНКАМІ

Гэта гісторыя здарылася ў пачатку 2000-х гадоў. Зарплаты, пенсіі ды стыпендыі толькі пачыналі пераводзіць на банкаўскія карткі. Што гэта такое, трэба было тлумачыць і тлумачыць.

Дык вось выкладчыца матэматыкі неяк паведаміла сваім студэнтам, што на чарговай класнай гадзіне адбудзецца сустрэча з банкамі.

— А якія патрэбны — літровыя ці трохлітровыя? — спытаў нехта з дзяўчат.

— З вадою ці без вады? — зашумелі іншыя.

— Я далёка жыву — не паспею з'ездзіць.

— Ты не паспееш... А ў нас у інтэрнаце пустых наогул няма — усе дамоў пазвозілі...

Як бы там ні было, дзяўчаты вырашылі схадзіць па параду да завуча, і, хоць было гэта і не першага красавіка, выкладчыца матэматыкі спыняць іх не стала: смех, як вядома, падаўжае чалавечае жыццё.

Завуч таксама ведала гэта і таму, уважліва паслухаўшы дзяўчат, параіла ім зрабіць так, як падказвае сумленне. «Толькі ж глядзіце, — дадала, — каб потым няёмка не было».

Пасля гэтых слоў дзяўчатам нічога не заставалася як... адшукаць слоікі — любой цаной.

І ўрэшце яны зрабілі гэта: знайшлі (прычым трохлітровыя!), напоўнілі вадой.

...Тое, што памыліліся, што ўсё зразумелі няправільна, — сцяміли адразу ж пасля таго, як пачалася «сустрэча з банкамі»: пасмяяліся са сваёй наіўнасці, слоікі пахавалі пад парты.

А завучу назаўтра прыйшлося прызнаць, што такіх адказных студэнтак яна ніколі яшчэ не бачыла.

**Таццяна Марцэвіч,**
*Лідскі раён.*

## ДЗЯДЗЬКАВА НАВУКА

Выпадкова пачула, як бабуля ўшчувае ўнука за двойку, як даводзіць яму, што правілы трэба завучваць на памяць і потым ведаць іх — «ну як табліцу множання»!

Гэты выраз і нагадаў мне далёкія школьныя гады і тое, як тую табліцу вучылі мы. Цікавая, між іншым, гісторыя.

Было гэта ў канцы шасцідзясятых ці ў пачатку сямідзясятых гадоў мінулага стагоддзя. У нашую вёску правялі электрычнасць: у хатах стала «відна, хоць голкі збірай»!

А далей — болей, у дзядзькі Антося з'явіўся тэлевізар «Сігнал-2». Па тым часе — рэч вельмі дарагая, і сам вясковец яе наўрад ці купіў бы. Дзядзьку дапамог брат, які працаваў недзе ў шахтах.

Як цяпер помню: паглядзець на гэтае дзіва сышлася ўся вёска. Старыя прынеслі з сабой зэдлікі, малыя паселі на падлозе каля самага тэлевізара.

Глядзелі кінафільм «Каўказская палонніца». І столькі радасці было, стольκі захаплення, што, здаецца, і дадому б ніхто не ішоў: сядзелі б і глядзелі — ну ўсё запар. Але ж хто такое дапусціць?

Дзядзька Антось, трэба сказаць, чалавекам быў: час ад часу дазваляў вясковай дзятве паглядзець казкі ды мульцікі. «Ну, пачакай!» — быў самы любімы. З нецярпеннем чакалі новых серый і вучылі... «табліцу множання», бо глядзець тэлевізар дзядзька дазваляў толькі тым, хто яе засвоіў, а хто не, — выбачайце.

У выніку ніхто не хацеў адстаць ад іншых: нечага не ўбачыць па тэлебачанні. Вось такая была матывацыя.

Потым, калі сталі дарослыя, з удзячнасцю ўспаміналі дзядзькаву навуку, бо набытыя веды не раз прымянялі на практыцы.

**І. Салата,**
*г. Гродна.*

## БАЧУ МЭТУ — НЕ БАЧУ ПЕРАШКОД

Усё мяняецца, нават самае асноўнае — інстынкт падаўжэння роду. Хлопцы нейкія не тыя пайшлі — не арлы! Дзеўкі дамагацца, біцца за яе? Ды каму гэта трэба? А вось некалі...

Некалі ініцыятыва за хлопцам ва ўсім была — ад «паднесці партфель», да «выходзь за мяне». Не згаджаецца? Тады...

У тыя старыя добрыя часы адзін мой знаёмы (назавём яго Пятром) закахаўся ў дзяўчыну — да страты пульсу, можна сказаць. І нават з хлопцамі «на кулаках дамовіўся», што Маруся толькі яго. Заставалася з ёй самой неяк «дамовіцца», хоць тая ні слухаць, ні нават глядзець у той бок не хацела, з-за чаго і на танцы хадзіць перастала.

Пётра, бедны, каля дома яе дзяжурыць стаў. У акенца пастукае — выйдзі, маўляў, а тая дык нават не пакажацца...

Хлопцы раілі: плюнь ты... Мала дзевак, ці што!

«Многа», — кажа Пятро, — але мне патрэбна адна — Маруся».

А тут, як на ліха, павестка ў ваенкамат, радня, можна сказаць, «Последний нонешний денечек...» запець збіраецца.

Хлопцу што рабіць? Трэба ж неяк вызначыцца — пагаварыць з абранніцай. Выпіў для смеласці, пайшоў да вядомага дома. Бачыць, святла ў вокнах няма. І ў Марусіным таксама. Але ж, што называецца, бачу мэту — не бачу перашкод: не пускаюць у дзверы, дык я...

Пётра лёгка знайшоў драбіны, залез на дах летняй кухні, ціха выдраў... трубу — стаў разбіраць комін, каб потым праз дзірку...

Ён амаль да столі ўжо дайшоў, калі за нешта зачапіўся і... Нарабіў грукату.

У хаце адразу ўсчаўся гвалт, на падворку запалілася святло, і ў споднiках, з калом забегаў Марусін бацька (думаў, што злодзей лезе).

У Пеці, на шчасце, спрацаваў інстынкт: скочыў на зямлю і ходу. Праўда, быў апазнаны.

...Уранку пацярпелы бок пайшоў у сельсавет да ўчастковага. Туды ж запрасілі і бацьку Пятра. Калегіяльна вынеслі досыць мяккае пакаранне (ну не псаваць жа хлопцу жыццё): хай паправіць комін і дах, а там...

Пад марш «Развітанне славянкі» Пётра адбыў на службу і вярнуўся з яе не адзін, а з жонкай. Ну, чым не арол?

**С. Кузняцоў,**
*Быхаўскі раён.*

## З КАПУСТАЙ І БЕЗ

У даўным-даўно прамінулы вераснёўскі дзень да нас у школу прыехала працаваць новая настаўніца Алена Рыгораўна Капуста. Цікавае прозвішча, і калі б не яно, дык наўрад ці адбылася б гэта гісторыя, а так...

Усё пачалося з тэлефоннага званка. Нашаму загадчыку РАНА паведамілі з вобласці, сказалі, што настаўніца Капуста павінна прыехаць у Мінск. Значыць, чалавека трэба тэрмінова папярэдзіць, да таго ж — выпісаць камандзіроўку, выплаціць грошы на дарогу.

Карацей, загадчык РАНА стаў дзейнічаць: пазваніў настаўніцы і дома яе не заспеў — сказалі, пайшла ў музычную школу. Патэлефанаваў туды, спытаў:

— Капуста ў вас?

— У нас! У нас! — весела адказала сакратарка, бо за акном, у цесным коле настаўнікаў, і сапраўды была машына, якая з поля прывезла капусту.

— Прытрымайце яе, калі ласка, — папрасіў загадчык. — Я хутка заеду.

Сакратарка, паклаўшы слухаўку, тут жа выскачыла на вуліцу, падбегла да піяніста са словамі:

— Алег Сідаравіч, званіў загадчык РАНА, прасіў сказаць, што прыедзе па капусту.

— Во... А яго ж у спісе няма? — здзівіўся настаўнік. — І капуста ўжо ўся па мяшках.

Давялося пайсці да настаўнікаў — растлумачыць сітуацыю. Тыя, дзякаваць богу, усё зразумелі: падаставалі са сваіх поўных мяхоў найлепшыя качаны, злажылі іх у пусты (чаго не зробіш для начальства?) і з палёгкай уздыхнулі: справіліся!

Неўзабаве ля школы спынілася машына.

— Мне сказалі, Капуста тут? — спытаў педагогаў загадчык РАНА.

— Так, тут, але ж мы не ведалі, што яна вам трэба, — пачаў быў піяніст.

— Трэба. Ды яшчэ і як!

— Дык мы ж маглі б і падвезці...

На шчасце, у гэты момант на ганку з'явілася Капуста.

— Алена Рыгораўна, — кінуўся да яе загадчык, — хуценька ў машыну! Па дарозе ўсё растлумачу, пакуль — няма калі: бухгалтэрыя хутка зачыніцца.

...Настаўнікі музычнай школы, разабраўшы сваю капусту, неўзабаве разышліся па хатах. Адзін мех — з найлепшымі сакаўнымі качанамі — так і застаўся стаяць на вуліцы. Піяніст глядзеў на яго і не разумеў: чаму настаўніцу загадчык забраў, а капусту, пра якую так перажываў, не?

Прозвішча новай настаўніцы тады ніхто не ведаў...

**Зоя НАВАЕНКА,**
*г. п. Падсвілле, Глыбоцкі раён.*

**Рубрыку вядзе**
**Валянціна ДОЎНАР.**

**Ад яе ж.** *Як бачыце, конкурс на найлепшую вясёлую і праўдзівую гісторыю працягваецца.*

*Шчыра дзякую ўсім за добрыя словы на адрас газеты і рубрыкі, якую (паводле пісьмаў) «з задавальненнем чытаем» і ў якую «даўно збіраліся напісаць»...*

*То не трэба доўга збірацца, трэба — пісаць! І, вядома ж, выпісваць — адзіную (са штодзённых) беларускамоўную газету «Звязда», якая больш за сто гадоў з вамі, вашымі бацькамі і дзядамі.*


Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Неасабісты суб'ектыў



# Эфект гало

## Жыццё — дзівоснае. Нават калі свет з'язджае з глузду

ГЭТА было як у чароўнай казцы ці ў дзіцячым сне. Стоячы каля ганка вясковай хаты, я здзіўлена залыпала вачыма, пасля іх пацерла, потым заплюшчыла і патрэсла галавой, каб прагнаць насланнё. Насланнё не праганялася — вакол яркага амаль поўнага месяца, што ў гэты час завісае над Анатолевым бярэзнікам каля рэчкі, на цёмным небе было намалявана светлым раўнюткае кола. Нібы чарцёжнік-волат уткнуў проста ў месяц ножку гіганцкага цыркуля і абвёў празрыста-белым алоўкам абсалютна правільную геаметрычную фігуру з даволі вялікім нават у нябесных маштабах радыусам. Карціна была ніколі ў жыцці не бачаная, заварожваючая. Падумалася нават, што гэта нейкі знак ад вышэйшай сілы — можа, усяму чалавецтву, можа, мне асабіста (сённяшнія абставіны падобным думкам вельмі нават спрыяюць).

Каб пераканацца, што ўсё гэта мне не мроіцца, выцягнула з хаты сястру, якая ўжо збіралася класціся спаць. Таццяна мая — асоба надзвычай уразлівая, і відовішча на небе яе прывяло ў стан лёгкага шоку. Так і стаялі, як дзве вароны, пільна ўглядаючыся ўверх, насцярожана чакаючы яшчэ нейкай праявы, злёгку дрыжучы — пэўна, ад пранізлівага холаду майскай ночы. Выйшла на ганак пляменніца — захвалявалася, чаму доўга не ідзём у хату. «Людка, глянь, якое дзіва!» — нястройным хорам адгукнуліся мы. Людка зірнула ўверх і раўнадушна пацiснула плячыма: «Знайшлі дзіва. Звычайны эфект гало. Знайшлі з-за чаго паўгадзіны дубець». — «А ты што, гэта бачыла калі?» — «Не бачыла, але ведаю. Астраномію ў школе трэба было вучыць, двоечніцы...»

ВОСЬ так наша выдатніца па астраноміі разбурыла амаль гатовае дзіва. Яна мела рацыю, гэта сапраўды было гало — аптычная з'ява, утварэнне дугаснага свячэння вакол магутнай крыніцы святла (сонца, месяца або нават яркага вулічнага ліхтара). З'яўленне гало звычайна выклікана ледзянымі крышталямі, якія ўтвараюцца ў перыстых аблоках у верхніх слаях трапасферы... Карацей, «Вікіпедыя» нам у дапамогу — і ад казкі нават следу не застаецца. Зрэшты, сучасная навука дайшла ў сваім развіцці да такой ступені, што любую з'яву гэтаксама суха і дэталёва растлумачыць можа. Нават каханне, якое, нібыта, усяго толькі рэакцыя нюху аднаго чалавека на ферамоны, што выдзяляе арганізм другога. (Ці той жа каранавірус — ён жа для ўсяго прагрэсіўнага чалавецтва не нябачная пагроза, а нешта такое пупырчатае, вельмі падобнае на насенне нейкай знаёмай расліны — выявамі «героя года» пад мікраскопам забітая ўся інтэрнэт-прастора.)

Але ёсць нешта, што навука растлумачыць ніяк не можа, дый нават і не спрабуе гэта рабіць. Чаму менавіта ты менавіта ў гэты час менавіта ў гэтым месцы выйшаў на вуліцу і паглядзеў на неба? І ўбачыў тое, што ніводнага разу да гэтага не бачыў за сваё, дзякуй богу, немалое ўжо жыццё? І — здзівіўся, уразіўся, захапіўся, паверыў у цуд, адчуў, што гэты цуд магчымы, і ўжо ніякае навуковае тлумачэнне не забярэ ў цябе гэтага імгненнага адчування. Можа, таму, што менавіта табе менавіта ў гэты час менавіта гэта адчуванне было патрэбна як ніколі? І хтосьці, ведаючы гэта, гіганцкім цыркулем намаляваў вакол месяца бялёсае кола і вывеў цябе з хаты на яго паглядзець?..

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1441.

Нумар падпісаны ў 19.30 14 мая 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# Мясцовае Самакіраванне

15 мая 2020 г. № 18 (554)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ТЭМА ТЫДНЯ

# БЕЛАРУСКІЯ КРАЯВІДЫ ЗАМЕСТ МОРА?

## Турызм ва ўмовах пандэміі: абараніць спажыўцоў, пазбегнуць банкруцтва фірмаў і звярнуць увагу на сваё



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Паводле ацэнкі прэзідэнта Сусветнага эканамічнага форуму Булута Багчы, эканамічныя страты ў сектары турызму з-за пандэміі складаюць каля 600 мільёнаў долараў, а да канца года могуць дасягнуць трыльёна. Гэтая сфера пацярпела ў цяперашній сітуацыі самая першая, яна ж, па прагнозах спецыялістаў, выйдзе з крызісу апошняя. Праблемы турызму сёння разглядаюцца на самым высокім узроўні і ў Беларусі. На мінулым тыдні адбылася сустрэча прэм'ер-міністра краіны Сяргея Румаса з міністрам спорту і турызму Беларусі Сяргеем Кавальчуком. На сустрэчы абмяркоўваліся бягучыя праблемныя пытанні турыстычнай галіны, а таксама магчымасць і неабходнасць распрацоўкі нарматыўна-прававога дакумента, які дазволіць улічыць інтарэсы спажыўцоў турыстычных паслуг і турыстычных агенцтваў, а таксама прадугледзець мяккі выхад з крызісу, які накрыў увесь свет.**

стар. 3

# У знак сяброўства і падтрымкі

## 20 тысяч масак перадаў нашай краіне парламент В'етнама

**Нацыянальны сход В'етнама перадаў Савету Рэспублікі сродкі індывідуальнай аховы. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты беларускага парламента.**

20 тысяч масак перададзена паслу Беларусі ў В'етнаме Уладзіміру Гошыну кіраўніком канцылярыі парламента Нгуен Ханьь Фук ад імя старшыні Нацыянальнага сходу Нгуен Тхі Кім Нган. «Аказаная парламентам В'етнама бязвыплатная дапамога — знак сяброўства і падтрымкі намаганняў Беларусі па супрацьдзеянні распаўсюджванню каранавіруснай інфекцыі. Беларускі бок удзячны за гэтую дапамогу», — адзначылі ў прэс-службе.

Трэба сказаць, што абедзве краіны звязвае шматгадовае сяброўства, актыўна развіваюцца парламенцкія сувязі. Так, летась падчас афіцыйнага візіту Нгуен Тхі Кім Нган у беларускую сталіцу прайшла яе сустрэча са старшынёй Савета Рэспублікі Наталляй Качанавай, падчас якой бакі пацвердзілі ўзаемнае імкненне ўмацоўваць супрацоўніцтва, у тым ліку па лініі парламентаў.




## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### Падатковая палёгка



Віцебскія дэпутаты пагадзіліся ў два разы панізіць памер адзінага падатку і зрабілі гэта першыя ў краіне. стар. 2

### Паміж Прыпяццю і Случчу



Якія ідэі рэалізуюць на Жыткавіччыне, каб прывабіць да сябе турыстаў? стар. 4

### ТурНягоды



Як пара сужэнцаў з Гомеля марыла аб першай сумеснай вандроўцы і што з гэтага выйшла. стар. 13

### «Пасля кірмашу»



Унікальны праект распрацавалі на Міншчыне да 100-годдзя твора Янкі Купалы «Паўлінка». стар. 14

### Чысты вадаём



З панядзелка стартуе традыцыйная вясенняя акцыя па зборы смецця з прыбярэжных зон рэк і азёр. стар. 14

ПРАЕКТ

# ЛЁС СЯМ'І — ЛЁС КРАІНЫ

## Беларускія парламентарыі прынялі ўдзел у праекце «Памяць сэрца»

**Яны расказалі аб родных, якія абаранялі Радзіму ў 1941—1945 гадах, і аб рэчах, што сталі сямейнымі рэліквіямі.**

Цэлы шэраг сюжэтаў падрыхтавала Міждзяржаўная тэлерадыёкампанія «Мір» пры падтрымцы Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Парламентарыі краін СНД паўдзельнічалі ў гэтым праекце, паведамілі ў прэс-службе МПА СНД.

Члены Савета Рэспублікі Андрэй Русаковіч і Каліна Капуцкая расказалі аб сваіх родных, якія змагаліся на франтах Вялікай Айчыннай вайны, і рэчах, што захоўваюцца ў іх сем'ях як памяць аб героях. Таксама ў праекце паўдзельнічалі і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Лілія Ананіч, Сяргей Дзік, Тэнгіз Думбадзэ, Андрэй Злотнікаў, Іна Крачак, Ірына Луканская і Ігар Марзалюк.

Праект «Памяць сэрца» аб'ядноўвае народы краін і збліжае прадстаўнікоў розных пакаленняў. У кароткіх сюжэтах аб фатаздымках, узнагародах, лістах з фронту можна ўбачыць не толькі лёсы герояў, якім яны належалі, але і вялікую агульную гісторыю народаў, што заваявалі Перамогу.

Ролікі з парламентарыямі і іншымі ўдзельнікамі праекта з Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Расіі, Таджыкістана і Узбекістана транслююцца на тэлеканалах «МІР» і «МІР 24», тэлесюжэты ёсць і на сайце Міжпарламенцкай асамблеі СНД.

Між іншым, медыяпраект працягваецца — ён будзе напаўняцца новымі гісторыямі на працягу 2020 года, які ў краінах СНД аб'яўлены Годам 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў. Падтрымаць праект «Памяць сэрца» можа кожны, у каго захаваліся рэчы родных-вайскоўцаў. Дзеля гэтага трэба апублікаваць на сваёй старонцы ў сацсетках фота або відэа з гісторыяй свайго героя і сямейнай рэліквіяй, адзначыўшы яе хэштэгам #памятьсердца. Гэта могуць быць, напрыклад, лісты з фронту, гадзіннік, узнагароды — любая рэч, якая захоўвае памяць і звязвае пакаленні. Самыя цікавыя гісторыі тэлеканалы абяцаюць паказаць у эфіры.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**

# АБ'ЯДНАННЕ ЮНЫХ

## Асацыяцыю органаў маладзёжнага самакіравання створаць у ЕАЭС

**Такая ініцыятыва прагучала падчас відэаканферэнцыі Асацыяцыі маладзёжных урадаў Расіі і маладзёжных арганізацый краін ЕАЭС. Удзел у форуме прынялі прадстаўнікі Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, паведаміла кіраўнік міжнароднага пратакола ЦК БРСМ Алеся Сазанкова.**

«Удзельнікамі відэаканферэнцыя па абмеркаванні праектаў Асацыяцыі сумесна з маладзёжнымі арганізацыямі краін ЕАЭС сталі прадстаўнікі Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана і Расіі, — расказала яна. — Падчас анлайн-сустрэчы бакі ініцыявалі стварэнне Асацыяцыі органаў маладзёжнага самакіравання краін ЕАЭС. Плануецца, што гэтыя арганізацыі пяці краін будуць рэалізоўваць сумесныя праекты».

Пачатак актыўнага ўзаемадзеяння БРСМ з Асацыяцыяй маладзёжных урадаў Расіі пакладзены летась, калі было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве. Арганізацыі прымаюць актыўны ўдзел у партнёрскіх міжнародных праектах, увесь час пашыраючы межы маладзёжных зносін. Дарэчы, Асацыяцыя маладзёжных урадаў Расіі створана ў 2009 годзе і на сённяшні дзень аб'ядноўвае больш за 4 тысячы членаў маладзёжных урадаў і ініцыятыўных груп у 72 суб'ектах Расіі.

**Паводле БелТА**

ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА ДРУКАВАНАГА

# ПАРУЧЫЦЕЛЬСТВА І МІЛАСЭРНАСЦЬ

## Пытанні рэсацыялізацыі вызваленых па амністыі варта прапрацоўваць загадзя

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, старшыня Беларускай рэспубліканскай калегіі адвакатаў (БРКА) Віктар ЧАЙЧЫЦ лічыць важным пытанне рэсацыялізацыі і паручыцельства, прадугледжанае законапраектам аб амністыі ў сувязі з 75-годдзем Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, які быў быў разгледжаны днямі ў Савеце Рэспублікі. («МС» пісала аб гэтым у мінулым нумары.)**

— Вяртанне тых, хто адбываў пакаранне, у грамадства, у свабоднае паўсядзённае жыццё — адно з самых важных пытанняў, якое адлюстравана ў выглядзе канкрэтных мер, — лічыць сенатар. Дакумент прадугледжвае, што Савет Міністраў, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы арганізуюць своечасовы ўлік асоб, вызваленых па амністыі-2020, ды дапамогуць ім у працоўным і бытавым уладкаванні.

Для непаўналетніх, якія падпадаюць пад амністыю, будзе задзейнічаны інстытут паручальніцтва. Паручальнікамі могуць стаць бацькі, блізкія сваякі, органы апекі і папячыцельства, якія абавязваюцца кантраляваць і дапамагаць у рэсацыялізацыі. Сірот або іншых непаўналетніх, каторых з якіх-небудзь прычын немагчыма перадаць бацькам або блізкім сваякам, аддадуць у дзіцячыя дамы, дзіцячыя вёскі (гарадкі), школы-інтэрнаты для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Вызваленых непаўналетніх могуць накіраваць у прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы або дапамагчы ў працаўладкаванні.

Рэсацыялізацыя прадугледжвае таксама прыняцце мер, якія дазваляюць не дапусціць здзяйснення вызваленымі па амністыі новых злачынстваў, і правядзенне выхаваўчай работы.

Інвалідаў I або II групы, і асоб, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту, якія маюць патрэбу ў пастаянным доглядзе або дапамозе, накіруюць у дамы-інтэрнаты для састарэлых і інвалідаў у адпаведнасці з пералікам медыцынскіх паказанняў і супрацьпаказанняў. Акажуць дапамогу і тым вызваленым, якім неабходна лячэнне ў амбулаторных або стацыянарных умовах.

— У грамадстве часам існуе недавер і прадузятае стаўленне да раней судзімых. Таму вельмі важна, як будуць падводзіць сябе вызваленыя па амністыі ў перыяд рэсацыялізацыі: ці праявяць працавітасць, ці пакажуць сваімі паводзінамі, што выправіліся, вярнуліся да стваральнай працы і жыцця, — адзначыў Віктар Чайчыц. — Грамадзянам варта з міласэрнасцю ставіцца да такіх людзей, працягваць ім руку дапамогі. Таму што асуджанымі могуць быць звычайныя людзі, якія спатыкнуліся ў жыцці і якіх было б няправільна да канца іх дзён лічыць злачынцамі.

Паводле інфармацыі, агучанай у Савеце Рэспублікі **міністрам унутраных спраў Юрыем КАРАЕВЫМ,** ад розных відаў пакаранняў вызваляць 5372 асуджаных. Амністыя прадугледжвае поўнае, частковае або ўмоўнае вызваленне ад пакарання, замену неадбытай часткі больш мяккім пакараннем або зняцце судзімасці.

**Паводле БелТА.**

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

# КРЫТЭРЫЙ АЦЭНКІ МЯСЦОВАЙ УЛАДЫ

**Днямі адбылася сесія Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, на якой зрабілі прыемны сюрпрыз прадстаўнікам бізнесу: народныя абраннікі, каб падчас пандэміі дапамагчы індывідуальным прадпрымальнікам і іншым, хто працуюць на сябе, у два разы (!) панізілі памер адзінага падатку. І зрабілі гэта першыя ў краіне, выконваючы Указ Прэзідэнта № 143 «Аб падтрымцы эканомікі», прыняты 24 красавіка 2020 года.**

Падатковыя паслабленні ў другім і трэцім кварталах датычаць прыкладна 6,5 тысячы ІП і каля 2,5 тысячы самазанятых. Адпаведныя рашэнні да сярэдзіны мая прымуць мясцовыя Саветы ў гарадах і раёнах Віцебшчыны.

Галоўная жа тэма, якая абмяркоўвалася на сесіі, вельмі цесна звязана з бізнесам. Размова ішла пра занятасць і выкананне дэкрэта № 3, прынятага, каб спрыяць у пошуку работы тым, хто ў гэтым зацікаўлены.

Кіраўнік «абласнога парламента» Уладзімір Цярэнцьеў канстатаваў, што менавіта ўзровень занятасці — адзін з найважнейшых крытэрыяў у ацэнцы дзейнасці як выканаўчай, так і прадстаўнічай улады. Калі людзі працуюць, ці маюць магчымасць выбіраць, чым займацца, значыць, на месцах адказныя асобы разумеюць важнасць узаемадзеяння з вытворцамі, прадстаўнікамі бізнесу, агітуюць распачаць сваю справу.

Намеснік старшыні Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, старшыня Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Хрыстафораў паведаміў, што летась па садзейнічанне ў працаўладкаванні звярнуліся 25 тысяч чалавек — на 16 % менш, чым у 2018 годзе. Наймальнікамі былі заяўлены амаль 8 тысяч вакансій — у 1,2 раза больш, чым пазалетась.

Найбольшая колькасць свабодных рабочых месцаў на прадпрыемствах апрацоўчай прамысловасці — 22 %; сельскай, лясной і рыбнай гаспадаркі — 18 %, будаўніцтва — 10 %, аховы здароўя і сацыяльных паслуг — 9 %.

Па-ранейшаму адзначаецца тэндэнцыя зніжэння колькасці беспрацоўных. Калі на 1 студзеня 2019 года на ўліку ў службы занятасці знаходзілася 2 тысячы чалавек, то на пачатак бягучага года — 1,5 тысячы.

Дзякуючы дэкрэту № 3 «Аб садзейнічанні занятасці насельніцтва», у рэгіёне стварылі двухузроўневую сістэму садзейнічання ў працаўладкаванні. Гэта робіцца як органамі дзяржаўнай службы занятасці, так і пастаяннымі адпаведнымі камісіямі, падкрэсліў дэпутат.

Дарэчы, толькі летась праведзена больш за 1,1 тысячы пасяджэнняў, з іх 161 — выязное. У камісіі звярнуліся 50 тысяч чалавек, у тым ліку 600, якія вядуць асацыяльны лад жыцця. І, дарэчы, каля трыццаці з апошніх пачалі працоўнае жыццё. А прыблізна 260, якія, скажам так «весела жылі», выпісалі «пуцёўкі» ў ЛПП...

Асаблівая ўвага аддавалася грамадзянам, якія не здольныя на роўных умовах канкурыраваць на рынку працы. Былі працаўладкаваныя больш за 1700 чалавек, якія маюць патрэбу ў сацыяльнай абароне, на асаблівы кантроль узята пытанне эфектыўнай занятасці людзей з інваліднасцю.

> Народныя абраннікі, каб падчас пандэміі дапамагчы індывідуальным прадпрымальнікам і іншым, хто працуюць на сябе, у два разы (!) панізілі памер адзінага падатку. І зрабілі гэта першыя ў краіне.

Працаўладкаваных беспрацоўных, якія маюць дадатковыя гарантыі занятасці, летась было на ўзроўні 53 %.

У сувязі з ростам попыту наймальнікаў на рабочую сілу перагледжаны падыход да арганізацыі працэсу навучання беспрацоўных. Акцэнт зроблены на падрыхтоўку кадраў «пад заказ». І гэтаму спрыяў пільны аналіз вывучэння попыту на рынку працы і выхад на адкрыты дыялог з наймальнікамі, падзяліўся вопытам Аляксандр Хрыстафораў. У выніку з 695 беспрацоўных, накіраваных на навучанне, «пад заказ» — каля 480 чалавек.

У Віцебскай вобласці ў першым квартале на 113 % выканалі заданне па працаўладкаванні на зноў створаныя рабочыя месцы (1243 чалавекі). А ўсяго сёлета запланавана такім чынам даць магчымасць зарабляць 5500 грамадзянам.

Узровень фактычнага беспрацоўя, якое вызначаецца па метадалогіі Міжнароднай арганізацыі працы, летась у рэгіёне склаў 3,6 %. І гэта на 1,2 % менш да ўзроўню 2018-га.

З 15 раёнаў, вызначаных тэрыторыямі з напружанай сітуацыяй на рынку працы, на пачатак бягучага года адзначаецца паляпшэнне ў 11 раёнах у параўнанні з аналагічным перыядам 2019-га. І гэта дазволіла скараціць да дзевяці колькасць праблемных раёнаў. У Аршанскім і Чашніцкім палепшаны ўсе паказчыкі. І станоўчая тэндэнцыя захоўваецца. Па інфармацыі на 1 красавіка, з дзевяці раёнаў палепшылі сітуацыю восем. Без змен сітуацыя захавалася на Гарадоччыне.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

# БЕЛАРУСКІЯ КРАЯВІДЫ ЗАМЕСТ МОРА?

## Не даць абрынуцца ўсёй сістэме

Пандэмія каранавіруса спарадзіла адразу шэраг праблем у турызме. Першая, з якой сутыкнуліся прадстаўнікі Міністэрства спорту і турызму, — гэта ў адзін момант закрытыя граніцы многіх краін. Ведамству неабходна было хутка вывесці сваіх грамадзян з розных куткоў свету, і з гэтым беларусы справіліся даволі аператыўна. Другая ж праблема больш доўгатэрміновая: распрацаваць шэраг мер па выхадзе турыстычнай сферы з крызісу, у якім яна знаходзіцца цяпер.

— У красавіку быў падпісаны Указ № 143 «Аб падтрымцы эканомікі», які ўключыў першачарговыя меры па забеспячэнні ўстойлівай работы эканомікі і сацыяльнай сферы краіны ва ўмовах сусветнай эпідэміялагічнай сітуацыі, — расказвае **дырэктар Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь Ірына ВАРАНОВІЧ.** — Указ ахоплівае шыро-



кі спектр кірункаў і перш за ўсё прадугледжвае падтрымку ў сферах падаткаабкладання, працоўных адносін, у тым ліку сацыяльнай падтрымкі, змяненні ў правядзенні дзяржаўных закупак і іншыя меры, але на сённяшні дзень мы вельмі выразна адчуваем неабходнасць нарматыўна-прававога дакумента менавіта ў сферы турызму. Таму што наша галіна пацярпела адна з першых.

Ірына Варановіч адзначыла, што ўжо на працягу некалькіх тыдняў вядзецца падрыхтоўка комплексу мер па падтрымцы турызму ў Беларусі, на аснове якога распрацоўваецца нарматыўна-прававы дакумент з улікам двух бакоў. З аднаго боку, улічваюцца інтарэсы спажыўцоў, якія часткова альбо цалкам аплацілі свае паездкі за мяжу для адпачынку, а з другога — інтарэсы прадстаўнікоў турыстычных кампаній, што прадалі гэтыя туры.

— Перад намі стаіць галоўная задача — вытрымаць баланс і не даць абрынуцца ўсёй сістэме; зрабіць так, каб турыстычная сфера змагла вытрымаць гэты крызіс, і не толькі вытрымаць, але і годна выйсці са складанай сітуацыі. Гэты дакумент павінен дазволіць захаваць рабочыя месцы, а таксама абараніць спажыўцоў і падтрымаць турыстычны бізнес, каб яны змаглі выканаць свае абавязацельствы перад кліентамі і не спынілі сваю дзейнасць, — адзначае Ірына Мікалаеўна.

## Выручкі няма, а абавязацельствы засталіся

— Праблема заключаецца ў тым, што з сярэдзіны сакавіка гэтага года ў турызме не вядзецца ніякай дзейнасці. Гэта значыць — адсутнічае выручка, яе проста няма, — абмалёўвае сітуацыю **старшыня Рэспубліканскага саюза турыстычных арганізацый Аксана БІЧУН.** — Пры гэтым абавязацельствы перад спажыўцамі, якія купілі ў нас пуцёўкі на раннім браніраванні,

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*



а гэта каля 300 тысяч беларускіх грамадзян, засталіся.

Агульная сума дагавораў, або, інакш кажучы, сума доўгу турыстычных арганізацый перад турыстамі, па падліках Аксаны Бічун, складае на сённяшні дзень каля 400 мільёнаў беларускіх рублёў. Акрамя таго, абавязацельствы турыстычных фірмаў засталіся і перад плацяжамі ў бюджэт, перад работнікамі, арэндадаўцамі і іншымі пастаўшчыкамі, якія забяспечваюць работу офісаў.

— Гэты калапс можа прывесці да пагрозы банкруцтва ўсёй галіны, — са шкадаваннем адзначае спецыяліст. — У многіх краінах свету сёння заканадаўча замацавана права адтэрміноўкі грашовых абавязацельстваў да 2021 года, а ў некаторых нават і да 2022-га, таму ўзнікла сітуацыя, калі мы па заканадаўстве Рэспублікі Беларусь абавязаны вярнуць грошы спажыўцу ў тэрмін 7—14 дзён, а з другога боку, не можам так зрабіць, таму што гэтых грошай у нас няма. Выконваючы пагадненні перад спажыўцамі, мы пералічылі сродкі прымаючым бакам, што забяспечваюць гэтую дамову. Авіякампаніі, хатэльеры, прымаючыя краіны гэтыя грошы атрымалі, але ва ўмовах каранціну не могуць вярнуць іх нам. Хацелася б падзякаваць усім турыстам, якія сёння пераносяць туры на 2021 год або цярпліва чакаюць, разумеючы сітуацыю, у якой апынуліся тураператары і турагенты Беларусі.

Аксана Анатолеўна адзначае, што да сустрэчы з Сяргеем Румасам і Сяргеем Кавальчуком руху насустрач айчыннаму турызму з сакавіка наогул не было, цяпер жа з'явілася надзея на падтрымку турыстычнай сферы:

— Мы чакаем гэты нарматыўны дакумент, які дапаможа перш за ўсё выканаць свае абавязацельствы ў поўным аб'ёме для нашых спажыўцоў, захаваць іх грошы і аднавіць турыстычную галіну.

**Старшыня Рэспубліканскай асацыяцыі турыстычных агенцтваў Алена КУДЛАКОВА** сцвярджае: каб агенцтвы змаг-



лі працягнуць сваю дзейнасць, ім неабходна адтэрміноўка абавязацельстваў — на сённяшні дзень гэта самае галоўнае пытанне, таму што кожная заява турыста аб вяртанні грашовых сродкаў можа прывесці да суда, а суд, нават калі ён адзіны, — да банкруцтва турыстычных агенцтваў. «На сённяшні момант пра масавасць банкруцтваў або закрыццё агенцтваў казаць не даводзіцца, але гэта перш за ўсё таму, што прадстаўнікам турыстычнай галіны ўдаецца знаходзіць агульную мову з турыстамі», — адзначае яна.

Цяпер у турыстычнай галіне зарэгістраваны 1544 суб'екты — гэта 5 тысяч работнікаў турыстычных арганізацый, а сукупнасць беларусаў, уцягнутых у сферу гасціннасці — сюды ўваходзяць санаторыі, і аграэкасядзібы, і прыдарожны сэрвіс, і гасцінічны бізнес, — складае не менш за 40 тысяч чалавек. Тэарэтычна ўсе гэтыя людзі ў найбліжэйшы час могуць застацца без работы.

## Адкрываюцца ўнутраныя магчымасці

Як правіла, калі знешнія граніцы закрытыя, то павінны адкрыцца ўнутраныя магчымасці: чакаецца, што людзі ў многіх краінах пераарыентуюцца на ўнутраны турызм. Ці рэальна гэта ў Беларусі?

— Цяперашняя сітуацыя ўзняла вострыя праблемы: аказалася, што ў нашай краіне адсутнічае інструмент уздзеяння на замежных пастаўшчыкоў. Грошы за мяжой, а як іх дастаць — незразумела, — дзеліцца меркаваннем **старшыня Рэспубліканскага саюза турыстычнай індустрыі Філіп ГУЛЫ.** — Наша арганізацыя арыентавана



на ўнутраны турызм, але праблема ў нас такая ж. Засталася дэбіторская запазычанасць з боку замежных кампаній, асабліва анлайн-агрэгатараў, якія разлічваюцца постфактум. Сёння многія турэцкія кампаніі, кампаніі, зарэгістраваныя на Маёрцы і ў Швейцарыі, вінныя грошы нашым тураператарам і аб'ектам размяшчэння. Цяпер дастаць гэтыя сродкі практычна немагчыма — трэба аб'ядноўвацца, падаваць іскі ў міжнародныя судовыя інстанцыі. Усё гэта досыць складаны працэс. У той жа час па выніках першага квартала мы атрымалі досыць нядрэнныя перадаплаты ад замежных кліентаў, але гэтыя туры не адбыліся, і цяпер мы вымушаны вяртаць грошы. Гэта значыць, замежнікі іх не вяртаюць, а мы рабіць гэта вымушаны. Хацелася б нейкага агульнага падыходу: адтэрміноўваць вяртанне папярэдняй аплаты ці атрымаць магчымасць даваць ваўчары на наступны год.

Філіп Анатолевіч адзначае, што з 18 сакавіка, калі Расійская Федэрацыя канчаткова закрыла граніцу, беларуская інфраструктура і наш экспарт у турызме не атрымаюць выручкі. Гэта значыць, тураператары, перавозчыкі, экскурсіёншчыкі, музеі, аб'екты грамадскага харчавання, якія знаходзяцца ў рэгіянальнай інфраструктуры, і сам гасцінічны сектар не зарабляюць.

— Недаатрыманая валютная выручка другога квартала склала 138 мільёнаў рублёў. У свеце існуе турыстычная інфраструктура ўнутранага ўязнога турызму, якая дазваляе яе выратаваць за кошт унутранага патоку. Замежнікаў няма, але свае грамадзяне ядуць, адпачываюць, начуюць, і гэта неяк падтрымлівае інфраструктуру. У такой сітуацыі выйграюць краіны з вялікай ёмістасцю рынку — Расія, Кітай, ЗША, Францыя, Германія, Польшча, дзе колькасць насельніцтва і пакупніцкая здольнасць дазваляюць пераарыентавацца на ўнутраны рынак. Ён вялікі, там ёсць і горы, і моры, і рэкі, ёсць унутраная лагістыка, адпаведна, ёсць прастора для тураператара, які можа зрабіць пакеты паслуг і пусціць гэтыя грошы на ўнутраны рынак, — тлумачыць Філіп Гулы.

Паводле яго слоў, каля мільярда долараў беларускія грамадзяне раней трацілі на адпачынак за мяжой. Пасля крызісу гэтая сума значна скароціцца. Добра было б значную яе частку накіраваць на ўнутраны турызм, але ў такіх маленькіх краінах, як Бельгія, Ірландыя, Чэхія і ў тым ліку Беларусь, ёмістасці рынку няма, да таго ж адсутнічае лагістычнае плячо, не трэба пералятаць з горада ў горад.

— Таму мы бачым тэндэнцыю да міжрэгіянальнага турызму: маленькія краіны спрабуюць хутка ўвайсці ў кааліцыю з суседзямі. Прыбалтыйскія краіны аб'ядналіся паміж сабой і адкрылі граніцы адна для адной, каб наладзіць узаемапатокі. Для нас вялікае пытанне, ці адкрыецца граніца з Расіяй: калі адкрыецца, то гэта нас выратуе, калі не — разлічваць трэба будзе толькі на сябе. Хоць ёсць нядрэнныя шанцы наладзіць турыстычныя сувязі з Украінай, яна атрымлівае ад нас дастаткова вялікі выязны паток — гэта Затока, Карпаты і многае іншае, — а таксама праяўляе сваю цікавасць да Беларусі.

Філіп Гулы расказвае, у чым асноўная складанасць пераарыентацыі на ўнутраны турызм:

— Тураператар ва ўязным або ўнутраным турызме — гэта вытворца прадукту. У асноўным гэта розныя туры на байдарках і роварах, івэнты, туры выхаднога дня ў абласных цэнтрах або ў Мінску для жыхароў рэгіёнаў, экскурсійныя туры на аўтобусах. Але ўсё гэта групавы турызм — у перыяд каранавіруса ён будзе незапатрабаваны, таму асноўны турыстычны прадукт, які ёсць у нашай краіне, — гэта санаторыі, туры выхаднога дня ў гарадах, аграсядзібы, спа-комплексы. Тут паўстае прастора для развіцця рэгіянальшчыкаў: усе крэатыўныя жыхары нашых рэгіёнаў, у тым ліку краязнаўчыя музеі, цяпер будуць здольныя вырабляць свой прадукт, які можна зрабіць канкурэнтаздольным, яго будуць добра прадаваць і купляць. Гэты прадукт павінен быць даступным і танным.

> «Усе крэатыўныя жыхары нашых рэгіёнаў, у тым ліку краязнаўчыя музеі, цяпер будуць здольныя вырабляць свой прадукт, які можна зрабіць канкурэнтаздольным, яго будуць добра прадаваць і купляць. Гэты прадукт павінен быць даступным і танным.

Філіп Анатолевіч адзначае, што на прыкладзе бязвізавых зон Брэста і Гродна ўсе бачылі, як хутка беларусы здольныя пераарыентавацца, стварыць якасць і сэрвіс, прыдумаць новыя прадукты, але цяпер ім патрэбна дапамога дзяржавы.

— Нам трэба выпрацаваць пэўныя падыходы і данесці, у першую чаргу, рэгіянальным уладам, як метадычна пачынаць дзейнасць у гэтым кірунку.

Кола патэнцыйнага ўнутранага турызму разаўе рэгіянальную ініцыятыву адразу даць якасць і сэрвіс, таму што беларускія турысты — людзі вельмі патрабавальныя.

— Мне здаецца, досыць нядрэнна сюды змогуць інтэгравацца элементы аграпрамысловага комплексу, звязаныя з фермерскай гаспадаркай і экалагічна чыстымі прадуктамі, якія запатрабаваныя цяпер. Трэнд для еўрапейскага турыста сярэдняга ўзросту сёння — не столькі ў моры, колькі ў аздараўленні і адпачынку ад стомы, і тут нашы прыродныя фактары могуць стаць вялікім задзелам для будучыні.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

# ЧАРАЎНІЦТВА ВЫГАНАШЧАНСКАГА ЗАКАЗНІКА

## Каб бязвізавы турыст захацеў прыехаць да нас, яго трэба спярша зацікавіць

**Як наведаць славутасці Брэсцкай вобласці, не прыязджаючы сюды? Часткова задачу вырашыць партал «Брэсцкая вобласць: турызм, адпачынак, шопінг, забавы», які пачаў працаваць у канцы мінулага года. Дастаткова зайсці на сайт bresttravel.by, і можна любавацца, напрыклад, прыгажосцю Выганашчанскага заказніка з аднайменным возерам, блукаць па балотах Палесся, разглядаць Ружанскі і Касаўскі палацы.**

### Месца для самаізаляцыі

Карыстальнікі могуць знайсці тут інфармацыю пра гарады і раёны вобласці, аб'екты размяшчэння і харчавання, даведацца пра санаторыі і аграсядзібы, цікавыя турыстычныя маршруты. Асобны раздзел прысвечаны бязвізаваму наведванню рэгіёна. Партал разлічаны на замежных турыстаў, найперш з Польшчы, Германіі, Расіі, Літвы. Ну і вядома, суайчыннікі знойдуць шмат новага, яшчэ раз, магчыма, нечакана адкрыюць для сябе Беларусь.

Інтэрнэт-рэсурс распрацаваны па заказе ўпраўлення спорту і турызму Брэсцкага аблвыканкама. Яго аўтарамі выступілі спецыялісты Рэспубліканскага фонду развіцця турызму і падтрымкі дзікай прыроды «Планета без меж». Асобныя матэрыялы сайта прысвечаны многім нашым славутасцям.



Напрыклад, заказнік «Выганашчанскае» аўтар рэпартажу Сяргей Плыткевіч называе ідэальным месцам для самаізаляцыі. Ён жа прапаноўвае гатовы маршрут для невялікіх кампаній, якія любяць дзікую прыроду. Далей — здымкі ваколіц маляўнічага Выганашчанскага возера, пейзажы, якія зачароўваюць цішынёй, велічнасцю, прасторамі. Ну і, вядома, багаты раслінны ды жывёльны свет заказніка. Тут водзяцца рэдкія птушкі, напрыклад барадатая няясыць. Яна сядзіць у гняздзе, падобным на скрыню, якое зрабілі для яе супрацоўнікі заказніка, і нярэдка трапляе ў кадр аматараў і прафесіяналаў фотасправы. А Надлідская града — лясны востраў сярод балота — прываблівае экстрэмалаў. Частка экскурсійных праходзіць па гаці. Тэхналогія пракладкі гаці ідзе з глыбокай старажытнасці, палешукі даўным-даўно пачалі рабіць дарогі на балотах. Ёсць тут і дрэвы з незвычайнымі каранямі, што тырчаць над зямлёй, нібы ногі... Паглядзіш на гэта, і ўжо хочацца пабыць там, паблукаць паміж волатамі-дрэвамі.

### Чалавек — энцыклапедыя Палесся

Хто жадае адкрыць для сябе Палессе, мусіць прачытаць пра яго нястомнага рупліўца і захавальніка Аляксея Дуброўскага. Відаць, ніхто не зрабіў столькі для папулярызацыі гісторыі палескага краю, для адкрыцця новых імёнаў і падзей, увекавечання памяці крыжамі, мемарыяламі, памятнымі дошкамі, як ён. А яшчэ шмат чаго выратаваў ад знішчэння і заняпаду. Аляксей Дуброўскі вывучыў і абгрунтаваў стварэнне цэлага шэрагу палескіх заказнікаў рэспубліканскага значэння і тым самым выратаваў ад знішчэння 62 тысячы гектараў палескіх балот. Спораўскае — адно з іх, цяпер яно вядомае ў свеце як заказнік «Спораўскі». А Качай-балота ў Ганцавіцкім раёне дзякуючы Дуброўскаму стала заказнікам «Падвялікі мох». Пра ўсё гэта можна прачытаць на новым багата ілюстраваным сайце. А прачытаўшы, вы захочаце і пабываць у неверагодных мясцінах, якія захавалі шмат чаго ледзь не з часоў Герадотавага мора. Распрацоўшчыкі партала на гэта і разлічвалі.



— Работа над дапаўненнем, удасканаленнем сайта вядзецца пастаянна — расказаў карэспандэнту МС **загадчык сектара турызму ўпраўлення спорту і турызму Брэсцкага аблвыканкама Дзяніс НІКІЦЮК.** — Цяпер вядзецца пераклад матэрыялаў на англійскую, нямецкую, польскую мовы.

### Патэнцыял для развіцця

Цяпер тая частка турыстычнай галіны, якая арыентаваная на экспарт паслуг, па вядомых прычынах узяла паўзу. Але ж прыйдзе час, і ўсё запрацуе зноў. Таму варта аглянуцца на вынікі, вызначыць арыенціры для работы. Можна казаць, што сфера турызму ў Брэсцкай вобласці мае значны патэнцыял для развіцця, да пачатку гэтага года назіраўся ўстойлівы рост. Можна прывесці такія лічбы: летась рэгіён наведалі 1 мільён 333 тысячы турыстаў, з іх крыху больш за 280 тысяч — замежныя грамадзяне з 80 краін свету. Экспарт турыстычных паслуг склаў 16,8 мільёна долараў ЗША.

Агульная колькасць аб'ектаў аграэкатурызму дасягнула 388. Паслугамі аграсядзіб скарысталіся больш за 80 тысяч турыстаў. З іх амаль 25 тысяч — грамадзяне іншых краін. Варта адзначыць, што ў вобласці, дакладней, у раёнах, якія ўваходзяць у турыстычную зону «Брэст», апошнім часам адкрыта амаль 400 новых аб'ектаў турыстычнай індустрыі, з іх 299 гандлёвых аб'ектаў, 13 аб'ектаў размяшчэння, 82 аб'екты грамадскага харчавання. У 37 магазінах рэгіёна ёсць магчымасць афармлення куплі па сістэме Tax Free. З прычыны павышэння інвестыцыйнай прывабнасці рэгіёна ўзрасла актыўнасць малога і сярэдняга бізнесу ў развіцці інфраструктуры. Бязвізавы рэжым стаў імпульсам для рэалізацыі інвестыцыйнага праекта па ўзвядзенні гасцініцы Hampton by Hilton, што дазволіла Брэсту стаць першым абласным цэнтрам краіны, у якім з'явілася сеткавая гасцініца буйнога міжнароднага брэнда. Цяпер працягваецца будаўніцтва двух турыстычных комплексаў: адзін з іх інвестар узводзіць у Брэсцкім раёне, другі — у Баранавіцкім.



### Новыя магчымасці

Як вядома, з 10 лістапада мінулага года ўступіў у сілу Указ Прэзідэнта № 300, які аб'яднаў бязвізавыя тэрыторыі Брэсцкай і Гродзенскай абласцей. Тэрмін бязвізавага знаходжання з мэтай турызму павялічаны да 15 сутак для грамадзян 73 краін. Вельмі карыснай для Брэсцкай вобласці стала магчымасць выхаду праз суседнюю Гродзенскую вобласць на турыстычныя рынкі краін Балтыі, для якіх адкрываецца прамы калідор у Брэст праз Белавежскую пушчу. Яшчэ адным новаўвядзеннем з'яўляецца тое, што замежнікі могуць перамяшчацца без віз па ўсёй тэрыторыі Брэстчыны пры ўмове руху ў складзе арганізаваных турыстычных груп. Іншымі словамі, з'яўляецца магчымасць не толькі пабываць у пагранічных раёнах вобласці, але і ўбачыць харастводна палескіх балот на ўчастку ад Кобрына да Пінска і Століна, а таксама наведаць палацы, сядзібы ў Бярозаўскім, Івацэвіцкім, Баранавіцкім раёнах — на свае вочы ўбачыць тое, пра што многія чыталі на інтэрнэт-партале.

Летась па бязвізе Брэстчыну наведала 32 тысячы турыстаў. Цяпер, калі б не пандэмія, былі б усе падставы чакаць падваення патоку падарожнікаў. Але ж з часам эпідэмія скончыцца, і людзі, засумаваўшы ў ізаляцыі, несумненна, стануць больш вандраваць, захочуць новых уражанняў. Таму на Брэстчыне працягваецца будаўніцтва новых аб'ектаў турыстычнай індустрыі, вядзецца навучанне кадраў, якія працуюць у адпаведнай галіне.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# Маляўнічы куток каля Прыпяці і Случы

**Харчаванне з выкарыстаннем экалагічных прадуктаў з сялянскай гаспадаркі, пешыя экскурсіі, рыбалка, сплавы па рацэ, паходы ў лес у грыбы ды ягады... Гэта толькі частка таго, што можа прапанаваць Жыткавіцкі край Гомельшчыны для аграэкатурыстаў.**

— Жыткавіцкі раён уваходзіць у сістэму турыстычных маршрутаў «Залатое кальцо Гомельшчыны», — кажа **загадчык сектара спорту і турызму аддзела адукацыі, спорту і турызму Жыткавіцкага райвыканкама Васіль ПІНЧУК.** — Нашы візітныя карткі: краязнаўчы музей і музей прыроды Беларусі, помнік пісьменніку Старажытнай Русі Кірылу Тураўскаму, «Замкавая гара» старажытнага горада, помнікі культавага дойлідства — тураўская царква Усіх Святых, Свята-Барыса-Глебская капліца і могілкі з цудатворнымі крыжамі.

Асаблівую цікавасць для арнітолагаў маюць заказнікі рэспубліканскага і мясцовага значэння, што размешчаны на тэрыторыі раёна. Цікавыя водныя і пешыя экскурсійныя маршруты, што пралягаюць у глыбінцы Палесся.



— На возеры Белае створаны буйны турыстычны комплекс: корпус з нумарамі з усімі выгодамі для пражывання з сям'ёй, — працягвае суразмоўнік. — Гэта ідэальнае месца, каб вудзіць рыбу, паспрабаваць сябе ў пераадоленні маршрутаў пешага турызму. Адным з папулярных месцаў лічыцца таксама «Дом паляўнічага і рыбалова», які адкрыты дзяржаўнай лесагаспадарчай установай «Жыткавіцкі лясгас».

Адзін з цікавых і перспектыўных кірункаў, лічаць у раёне, — гэта фітатурызм. У аграсядзібе ў вёсцы Боркі, напрыклад, да сёлетняга сезона адпачынкаў рыхтавалі пазнавальную праграму для дзяцей і іх бацькоў. Акцэнт ставіцца на стварэнне ўласнага аптэкарскага агароду і навучанне рэцэптам прыгатавання гарбаты з лекавых раслін.

— У гэтай аграсядзібе да сёлетняга сезона адпачынку рыхтаваліся вельмі сур'ёзна, — дадае Васіль Пінчук. — Узімку правялі рэканструкцыю памяшканняў і будынкаў для таго, каб адпачываць тут было зручна маламабільным людзям і тым, хто абмежаваны ў сваіх фізічных магчымасцях.

Зрабілі ў аграсядзібе таксама акцэнт на паўнавартасныя пазнавальныя і практычныя заняткі для дзяцей. Гарадскія хлопцы і дзяўчаты могуць паглядзець, як дзейнічае пчалярная гаспадарка, навучыцца гэтаму рамяству ці паназіраць, якімі прыстасаваннямі яшчэ нашы прадзеды лавілі дзікіх пчол.

Увогуле, мясцовыя жыхары ўпэўнены, што іх раён яшчэ атрымае належную ацэнку ад беларусаў — аматараў аўтамабільнага, пешага і воднага турызму. Развітая дарожная сетка дазваляе ўсім, хто жадае, прыехаць на адпачынак з сям'ёй і застацца на выхадныя ў маляўнічых кутках каля поймаў Прыпяці і Случы.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота дадзена сектарам спорту і турызму аддзела адукацыі, спорту і турызму Жыткавіцкага райвыканкама.**

Тэлесеткі

# СВЯТЛО ПРАЗ МУЗЫКУ



**Канцэрт «Еўропаззяе святлом» убачаць у гэтую суботу, 16 мая, у 45 краінах свету. Пачнецца ён у той самы час, калі звычайна праходзіць фінал міжнароднага конкурсу «Еўрабачанне», які з-за каранавіруса ўпершыню ў гісторыі перанесены на наступны год, і з тымі самымі ўдзельнікамі. Але праграма, гавораць арганізатары, адрозніваецца прынцыпова.**

«Eurovision: Europe Shine A Light» — не замена звыкламу фармату, а самастойны праект, які пройдзе ў «сталіцы СМІ» Нідэрландаў Хілверсюме. Па-першае, гэта наогул не конкурс: артысты не спаборнічаюць, а выступяць у падтрымку ўсіх тых, хто знаходзіцца ў самаізаляцыі дома, хто змагаецца з каранавірусам у краінах Еўропы і па-за яе межамі. Па-другое, у шоу прагучаць не цалкам конкурсныя песні, а толькі самыя яркія 30-секундныя фрагменты выступленняў — у тым ліку беларускага гурта VAL, які мусіў сёлета прадстаўляць нашу краіну. Акрамя таго, да гледачоў з цёплымі словамі звернуцца праз відэапаштоўкі пераможцы і зоркі «Еўрабачання» розных часоў. Напрыклад, пераможца «Еўрабачання-1979» Галі Атары выканае свой знакавы хіт «Алілуя» хорам з удзельнікамі мінулых гадоў дзіцячага конкурсу «Еўрабачанне».

Кульмінацыяй двухгадзіннага песеннага шоу мусіць стаць сумеснае віртуальнае выкананне песні «What's Another Year?». Ірландзец Джоні Логан выйграў з ёй конкурс 40 гадоў таму, у 1980-м, а сёлета прыхільнікі «Еўрабачання» з усяго свету знялі на яе свае аматарскія кліпы. Каб падарыць пазітыўны настрой мільёнам тэле- і інтэрнэт-гледачоў, арганізатары абяцаюць яшчэ шэраг сюрпрызаў, але па тэлевізійнай завядзёнцы да эфіру іх не раскрываюць.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота eurovision.tv.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

**Выпуск № 94**

Сваю новую задачу прапануе Міхаіл Кошаль з Мінска *(гл. дыяграму).*




Міхаіл Кошаль (Мінск).
Белыя: Крg1, Фh5, Ле3, Сb2, Кg4 (5).
Чорныя: Крf4, Сh6, Кg6, пп. d4, g7 (5).
Мат за 2 хады.

**Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, Мінск, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru**

* * *

Завяршыўся XV чэмпіянат Беларусі па завочнай гульні ў шахматы (першая ліга). Прызавыя месцы занялі: 1. Аляксандр Каралёў (Мінск) — 12,5 бала з 15 магчымых; 2. Юрый Бандарэнка (Магілёў) — 12; 3. Анатоль Крутавус (Мінск) — 11.

Аляксей Малашанкаў з Віцебска выйграў міжнародны завочны турнір па шахматах, які арганізавала шахматная федэрацыя Іспаніі. 15 удзельнікаў змагаліся ў гэтым спаборніцтве на працягу двух гадоў.

* * *

Калі беларускі спецыялізаваны бюлетэнь «Альбіна» адрасаваны найперш аматарам шахматнай кампазіцыі, то дадатак да яго «Альбіна плюс» змяшчае матэрыялы пра сувязі шахмат са светам літаратуры і мастацтва, пра захапленне шахматамі вядомых людзей. У адным з нумароў дадатку ў свой час быў змешчаны артыкул доктара філалагічных навук, прафесара Алеся Бельскага «Іх цуд згаснуць духу не дае... Шахматы ў жыцці і творчасці беларускіх пісьменнікаў» з кнігі «Экалогія душы». У прыватнасці, аўтар піша:

«Вывучэнне шахматнай тэмы змушае нас перанесціся аж у XIX стагоддзе, да часоў Адама Міцкевіча і Яна Чачота, калі ў Віленскім універсітэце таленавітая моладзь згуртавалася ў Таварыства філаматаў (сяброў навук). За шахматныя фігуры браліся ў шляхецкім, арыстакратычным асяродку. Пра гэта сведчыць верш Адама Міцкевіча «Да М***», напісаны ў 1823 годзе і прысвечаны каханай паэта Марылі Верашчакі:

*У шахматы гуляючы без спешкі,*
*Заўважыш ты ў канцы:*
*«Апошнім разам*
*На дошцы гэтак жа стаялі пешкі,*
*Калі вось так я з ім гуляла разам».*

(Пераклад Кастуся Цвіркі).

Паэт і рэвалюцыянер Тамаш Зан у лісце 1820 года да свайго сябра-філарэта Ануфрыя Петрашкевіча апавядаў пра наведванне Туганавіч, родавага маёнтка Верашчакаў, дзе ён бавіў час з Адамам Міцкевічам і Марыляй Верашчакай. Вось што піша Зан пра сустрэчу, якая падарыла радасць і цудоўны адпачынак: «У Шчорсах тры дні правёў з Французам, у Туганавічах не толькі з Адамам, але і папраўдзе высакароднымі і прамяністымі Верашчакамі, з прамяністай і самай добрай Марыяй, якую сам Адам вельмі любіць, з якой пан Тамаш вывучыў і спяваў некалькі песень Нямцэвіча, з якой у шахматы гуляў, выйграваў і прайграваў, якой паслаў прамяністыя правілы, якая і добрая, і прыгожая, і прыемная, якая варта быць жонкай канцлера». Трэба нагадаць, што менавіта Тамаш Зан пазнаёміў Адама Міцкевіча з Марыляй — паміж імі нарадзіліся шчырае сяброўства і вялікае каханне. Гульня ў шахматы давала магчымасць нязмушана гутарыць, жартаваць, поўніла маладыя сэрцы шчасцем душэўнага яднання.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1. Фb3! ~ 2. Кg6+ Крh7 3. f8Кх, 1... Ла7+ 2. Кр:а7 а2 3. Фb2х, 1... Ле8+ 2. feФ і 3. Фе5х (1... Ле6 2. Ф:е6, 1... Л:f7 2. Ф:f7). У пазіцыі з партыі белыя перамаглі шляхам 1. Ле8+ Сf8 (1... Крf7 2. Фd3+) 2. Л:f8+ Кр:f8 3. Кf5+ Крg8 4. Фf8+ Кр:f8 5. Лd8х. Першыя правільна адказалі Ігар Ананіч, Сяргей Цяльпук, Уладзімір Ізотаў, Віктар Жук, Мікалай Сергіенка.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV@R

# Службовы раман са шчаслівым фіналам

**Сёння ва ўсім свеце адзначаецца Дзень сям'і. Карыстаючыся нагодай, мы вырашылі даведацца, што робіць сямейныя саюзы моцнымі, шчаслівымі і доўгатрывалымі, і распыталі пра гэта тры пары, якія пазнаёміліся і працуюць на тэлебачанні. Спойлер: у кожным тандэме творчых людзей — свая адметнасць.**

## Заўсёды пакідаю апошнюю дольку апельсіна

***Наталля Казей (тэлежурналіст) і Міхаіл Максімаў (відэаінжынер), тэлеканал АНТ.***

**Наталля:** Калі я толькі прыйшла на АНТ, то нейкі час адчувала сябе няўпэўнена, паколькі было шмат незнаёмых людзей. Сярод іх і відэаінжынеры, якія манціруюць нашы праграмы, сюжэты. І вось неяк адказны за выпуск адправіў мяне на мантаж да Міхаіла. Не скажу, што закахалася з першага позірку, але адразу адзначыла яго пачуццё гумару і адкрытасць да іншых. Мы разам некалькі разоў працавалі, а потым ён паклікаў мяне на спатканне. Паколькі для кожнага з нас гэта другі шлюб, то хапіла розных прычын і перашкод на шляху да стварэння сям'і. Але я хачу ўсім, хто жыве і не адчувае сябе шчаслівым, пажадаць не баяцца мяняць сваё жыццё. Не варта быць заложнікам проста таму, што, па мерках грамадства, ты ўжо ўсё маеш... Што датычыцца работы, то Міхаіл прафесіянал, і гэта адна з тых рэчаў, за якія я палюбіла свайго мужа. Калі мы працуем разам, то гарантавана ствараем добры тэлевізійны прадукт. Можам звярнуцца адно да аднаго па параду, а часам і паспрачацца, бо ў кожнага сваё бачанне, як лепш. Але і на рабоце, і дома я часта згадваю его словы, што цяпер у нас чатыры плячы — значыць, усё пераадолеем, і мне становіцца спакойна. Без сумнення разумею, што муж — гэта мой чалавек. Раней я лічыла, што муж і жонка не павінны працаваць разам, а цяпер разумею, як добра, калі двое аб'яднаны агульнымі інтарэсамі. Прычым і акрамя працы ў нас шмат тэм для размоў, мы не стамляемся адно ад аднаго.



Што яшчэ патрэбна для шчаслівай і моцнай сям'і? Думаю, вельмі важна быць уважлівымі, клапаціцца і любіць. Усё гэта прапісныя ісціны, пра якія мы часта забываем. Але калі будзем заставацца самімі сабой і радаваць нават у дробязях сваю палавінку, то гарманічна будзе складвацца і работа, і сумеснае жыццё. І менш трэба звяртаць увагу на тое, што людзі скажуць. Мы з мужам, напрыклад, з задавальненнем адкрываем для сябе нешта новае, разам самаўдасканальваемся, вандруем. Нават вучымся ў чатыры рукі гатаваць ежу, хоць раней абое не вельмі любілі гэты занятак. І я з вялікай радасцю заўсёды пакідаю яму апошнюю дольку апельсіна (ён іх вельмі любіць), каб лішні раз пабачыць яго ўсмешку. Мы не баімся паказваць свае пачуцці, і вельмі спадзяюся, што нам удасца захаваць іх на доўгія гады. А я ўдзячная тэлеканалу АНТ, што сустрэла тут сваё каханне.

## Не было інтарэсу... а потым «пасябравалі» на «Фэйсбуку»

***Алена Воляк (кіраўнік праграмы «Добрай раніцы, Беларусь!») і Сяргей Воляк (галоўны дырэктар галоўнай дырэкцыі продажаў і маркетынгу, вядучы «Навін эканомікі», «Сферы інтарэсаў»), тэлеканал «Беларусь 1».***

**Алена:** Калі ўжо пабраліся шлюбам і выпадкова звярылі нашы пропускі, то аказалася, што прыйшлі працаваць у Белтэлерадыёкампанію ў адзін дзень у 2004 годзе. Тады ў кожнага з нас была сям'я, і мы, працуючы ў вялікай кампаніі, толькі часам віталіся ў ліфце. Я была рэдактарам праграмы «Добрай раніцы, Беларусь!», і ў ёй эканамічныя навіны вёў Сяргей. Але пастаянна блытала яго імя (паколькі ў мужа прозвішча Воляк, што для мяне сугучна з Воля, то я думала, быццам завуць яго Павел, бо асацыяцыя была з Паўлам Воляй). (*Смяецца. — Аўт.*) Ён быў жанаты мужчына з двума дзецьмі, у мяне — муж і дачка, таму мы ніяк не камунікавалі, не было ніякага інтарэсу. А потым неяк пару разоў перасекліся ў каментарыях у сацыяльных сетках і нас зацікавілі меркаванні і пазіцыя адно аднаго. «Пасябравалі» на «Фэйсбуку», аднак з часам перасталі падтрымліваць сувязь, хоць абое ўсведамлялі, што супадаем па каштоўнасцях і поглядах на жыццё. І толькі праз год, калі ўжо і Сяргей, і я былі не ў стасунках, то зноў выйшлі на кантакт і ў 2014 годзе стварылі сям'ю. І нашы дзеці пасябравалі. Мы ўсе разам ездзім адпачываць і любім праводзіць час разам... Для мяне вельмі важна, што мы працуем у адной сферы. Гэта дае ўзаемаразуменне, калі вы без слоў здольныя зразумець радасці і праблемы адно аднаго. Кожны з нас не ўмешваецца ў работу іншага, але нам важна адчуваць падтрымку. Няма паміж намі і канкурэнцыі, бо мы кіруем рознымі падраздзяленнямі, але дасягненні ў прафесіі сталі магчымыя, дзякуючы ўзаемнай веры, што ўсё атрымаецца ў кожнага з нас. Таму сакрэт быць шчаслівымі, як у прафесіі, так і ў сям'і, ёсць толькі адзін — каханне. Безумоўнае. Як адно да аднаго, так і да тых, хто ўваходзіць у вашу сям'ю. З каханнем працсей пераадольваць цяжкасці, прабачаць і хацець дзейнічаць. А інакш нічога не патрэбна. Таму так і атрымліваецца, што на тэлебачанні кожны з нас працуе на сваім полі дзейнасці, а дома мы сумесна працуем над тым, каб наша сям'я была дружная і шчаслівая.



**Алена ДРАПКО.**
**Фота з архіва герояў.**

***Больш гісторый глядзіце на сайце «Звязды».***

СУД ДЫ СПРАВА

# ТурНягоды

**Маладыя сужэнцы Ігар і Дар'я БАЧКУНОВЫ з Гомеля доўгі час марылі аб першай сумеснай вандроўцы і адпачынку на моры. Грошы на паездку, дзе ўсё ўключана, адкладвалі.**
**На пачатку сакавіка набылі пуцёўку: 11 дзён у Егіпце. Пакавалі ўжо чамаданы, але праз чатыры дні званок з турагенцтва спусціў іх з нябёсаў на зямлю — рэйс адменены. Адчуванне таго, што гэта памылка, змянілася расчараваннем і нервамі. Яны даслалі на адрас турфірмы ліст з просьбай вярнуць грошы — 1480 рублёў. Атрымалі адмову.**


travel.rambler.ru

— У нас было не ранняе браніраванне. Набылі пуцёўку, калі заставалася сем дзён да вылету, і ўсю суму наш турагент пералічыў на рахунак тураператара, — тлумачыць Дар'я Бачкунова, якая цяпер упэўнена, што рэалізатар туру выканаў свой абавязак і да яго не можа быць прэтэнзій. — Але тады на эмоцыях паспяшаліся падаць іск у суд на турагенцтва. Да выдаткаў за пералёт і пражыванне ў ім абазначылі таксама суму маральнай кампенсацыі — на абаіх тысяча рублёў.

Праўда, да суда справа не дайшла. Ацаніўшы сітуацыю, Дар'я з Ігарам яшчэ раз сустрэліся з кіраўніком турагенцтва.

— Ён прывёў доказы, чаму не можа вярнуць нам грошы. Тэлефануе нам, можа, праз дзень. Разам сочым за сітуацыяй. Мы ж не адны такія. Магчыма, у хуткім часе становішча з «замарожваннем адпачынку» зменіцца, будуць вызначаны ўмовы вяртання грошай, — кажа дзяўчына і дадае, што задаволена, бо турагент не пакінуў іх. Разам шукаюць выйсце з непрыемнай сітуацыі.

Як высветлілася, — сям'ю супакойвае надзея на выплату страхоўкі, якую яны аплацілі ў дадатак да пуцёўкі.

— Чакаем рашэння ад страхавой кампаніі, — тлумачыць гамяльчанка. — Калі не атрымаецца, то можна будзе скарыстаць магчымасцю і перанесці адпачынак — паляцець пазней, ёсць прапановы аж да красавіка наступнага года.

У любым выпадку маладыя людзі прыйшлі да высновы, што лепш выстаўляць прэтэнзіі да тураператара, а не да турыстычнага агенцтва.

— Страхавы пакет адной з украінскіх кампаній на пуцёўкі менавіта гэтага тураператара прапаноўваўся для набыцця толькі на працягу шасці дзён, — тлумачыць **Канстанцін СКАЧКОЎ — дырэктар гомельскага турагенцтва,** кліентамі якога і сталі сужэнцы Бачкуновы. — Страхавая кампанія запытала ад нас вялікі пакет дакументаў, да таго ж трэба было дасылаць скрыншоты ўсіх дзеянняў у асабістых кабінетах: як адбывалася аплата, у які тэрмін паступілі грошы на рахунак тураператара.

Канстанцін кажа, што дакументы з Гомеля адправілі па пошце яшчэ 23 сакавіка. Пацвярджэнне таго, што іх атрымалі ў Кіеве, прыйшло толькі 14 красавіка.

— Цяпер страхоўшчыкі чакаюць дакументальнага пацвярджэння плацяжоў ад тураператара. Увогуле сітуацыя ўнікальная. Сваім кліентам, якія цяпер не могуць вылецець, мы прапануем перабраніраваць рэйсы на больш познія даты. Разлічваем на тое, што сітуацыя зменіцца.

Канстанцін Скачкоў падкрэслівае, што яго прадпрыемства сем гадоў на рынку турпаслуг. У тым, што цяпер няма магчымасці вярнуць пакупнікам грошы, ён цвёрда ўпэўнены:

— Уся сістэма работы турыстычнай сферы — гэта пастаянны абарот сродкаў: ад кліента турфірмы пакідаюць сабе ад 5 да 11 працэнтаў, у залежнасці ад кошту туру, астатняе пералічваюць тураператару. Ён адпаведна — авіякампаніям, трансферам, гатэлям і гэтак далей. У авіякампаніі білеты выкупляюцца за год да пачатку сезона.

Праблема яшчэ і ў тым, тлумачыць турагент, што цяпер парушаны добрыя сувязі з усімі бакамі туріндустрыі: ніколі не было такого, каб узнікалі цяжкасці нават са стасункамі:

— Мы працуем з усімі буйнымі тураператарамі. Адпраўляем запыт — адказ па Беларусі чакаем не менш за тыдзень, з украінскіх офісаў — да чатырох дзён. Вельмі цяжка працаваць. Некаторыя кампаніі прагназуюць запад турыстычнага рынку на 90 %.

Між тым сужэнцы Дар'я і Ігар Бачкуновы, калі вырашылі адмовіцца ад прэтэнзій як пакупнікі паслугі турагенцтва, напісалі ў суд заяву аб адмове ад іску. Гэта аўтаматычна закрыла для іх магчымасць звярнуцца ў суд з пазовай аб абароне правоў спажыўцоў паўторна.

Аднак ёсць і іншыя прыклады. Апошнім часам з Гомельскай гарадской арганізацыяй ГА «Беларускае таварыства абароны спажыўцоў» заключана пяць дагавораў аб прадстаўленні інтарэсаў у судзе. У двух выпадках спажыўцам турфірмы прапанавалі падпісаць міравое пагадненне.

— Усе спажыўцы, якія звярнуліся да нас, рыхтаваліся адпачыць за мяжой, — **юрыст арганізацыі Андрэй БАБІЧ** падкрэслівае, што ніхто не шукае канфліктаў. — Напрыклад, днямі спажывец, якія заплаціў амаль 3700 рублёў за паездку на Кубу, пагадзіўся на «міравое» з турагенцтвам. Канешне, прадавец турпаслугі разумее, што калі прайграе справу ў судзе, то трэба будзе не толькі вярнуць унесеныя грошы спажыўцу, але выплаціць няўстойку, можа і маральную кампенсацыю, штраф у мясцовы бюджэт і пакрыць выдаткі таварыства абароны правоў спажыўцоў. Аднак на стадыі падачы пісьмовай прэтэнзіі турагенцтвы не згаджаюцца на выплату кошту пуцёўкі.

Пры гэтым, калі спажыўцу да судовага разбору прадавец вярнуў грошы за білеты, напрыклад, а пакупнік усё роўна не забраў судовую пазову, то ён павінен рыхтавацца да таго, што маральнай кампенсацыі ў судзе можа і не дачакацца, папярэджвае юрыст:

> «Уся сістэма работы турыстычнай сферы — гэта пастаянны абарот сродкаў: ад кліента турфірмы пакідаюць сабе ад 5 да 11 працэнтаў, у залежнасці ад кошту туру, астатняе пералічваюць тураператару. Ён адпаведна — авіякампаніям, трансферам, гатэлям і гэтак далей. У авіякампаніі білеты выкупляюцца за год да пачатку сезона.

— Праблема, на маю думку, у тым, што закон, канешне, на баку спажыўца, а не турфірмы, якая фактычна не аказала аплачаную паслугу, — дзеліцца ён меркаваннем. — Можна выйграць суд, але ў турагента няма грошай на рахунку, маёмасці ў юрыдычнай асобы таксама няма, турфірма банкрут, а судовыя разборы будуць доўжыцца месяцы.

Заяву аб абароне сваіх правоў у судзе напісаў і **гамяльчанін Віктар НОВІКАЎ.** Мужчына аплаціў паслугі транспартна-турыстычнага прадпрыемства, якое павінна было забяспечыць вылет яго непаўналетняй дачкі ў Афіны.

— Аплаціў без малога 490 рублёў, было ранняе браніраванне білетаў, — тлумачыць Віктар Васілевіч, дачка якога павінна была ляцець у Грэцыю на тры дні на спаборніцтвы па дзюдо. — Заключылі дагавор яшчэ 10 лютага. Ніхто ж не ведаў, што закрыюць межы. Мая дачка ў камандзе нацыянальнай зборнай і мела намер ляцець разам яшчэ з двума хлопцамі-дзюдаістамі.

Рэйс адмянілі, грошы абяцалі вярнуць, але не цалкам. Маўляў, менавіта ў дзень адмены рэйса авіякампанія ўнесла змены ва ўмовы вяртання грошай за паездку: «замарожваюць» паслугу на тэрмін да года. Гамяльчанін накіраваў іск у суд:

— Бо гэта не той выпадак, калі пераносіш адпачынак, напрыклад. Спаборніцтвы адмяніліся, і больш няма нагоды ляцець. На дасудовай сустрэчы прадпрыемства дало згоду вярнуць нам грошы за білеты, мы іх забралі, але пазова ж усё роўна перададзена ў суд.

Дарэчы, у горшым становішчы ў якасці спажыўца апынуўся трэнер тых самых дзюдаістаў, **выкладчык Гомельскага дзяржаўнага вучылішча алімпійскага рэзерву Яўген БЯДУЛІН.** За свае грошы ён набыў білеты для выхаванца. Аддаў амаль 600 рублёў:

— Білеты куплялі на спаборніцтвы больш чым за месяц да вылету, — кажа трэнер і тлумачыць, што спартсменам выплачваюць камандзіровачныя звычайна перад самым вылетам, таму ў хлопца не было сваіх грошай і трэнер яго падтрымаў. — Спаборніцтвы адмянілі, але білеты мы адразу не здалі, бо нас палохалі, маўляў — згубіце 30 % ад кошту. Праз два дні адмянілі і рэйсы. Мы звязаліся з турагенцтвам і папрасілі вярнуць грошы. Нам сказалі, што могуць вярнуць толькі пэўны працэнт ад усёй сумы — 386 рублёў і запэўнілі, што ў іншым выпадку не атрымаеце нічога.

Яўген Бядулін і маладыя спартсмены пагадзіліся на прапанаваную выплату:

— Цяпер думаем, што паспяшаліся, бо ўсё ж такі брала ад нас грошы транспартна-турыстычнае прадпрыемства, атрымліваецца, яно павінна разлічыцца.

Дзюдаісты склалі ў пісьмовай форме прэтэнзію і даставілі яе на электронны адрас і заказным лістом па пошце на прадпрыемства. Праз 14 дзён у выпадку адмовы ці проста ігнаравання спартсмены таксама збіраюцца падаваць іскавую заяву ў суд.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

А ЯК У ІХ?

# Кожны дзясяты будзе скарочаны

**Першы ў свеце тураператар TUI абвясціў у сераду, 13 мая, аб сваім намеры скараціць 8000 працоўных месцаў у свеце, гэта значыць больш за 10 % сваёй рабочай сілы, з прычыны пандэміі каранавіруса, якая прывяла да спынення большай часткі яго дзейнасці. Аб гэтым паведамляе швейцарскі часопіс Bilan.**

«Мы хочам назаўжды паменшыць наш адміністрацыйны цяжар на 30 % для ўсёй групы з наступствамі для прыкладна 8000 пасад, якія мы ці збіраемся займаць або ліквідаваць, — цытуе словы кампаніі часопіс.

Дарэчы, група налічвае каля 70 000 супрацоўнікаў па ўсім свеце. Паралельна з гэтым тураператар паведаміў аб значнай грашовай страце з кастрычніка да сакавіка, прыбытак знізіўся на 274,7 % да -763,6 мільёна еўра. Яго аперацыйны прыбытак (Ebit) таксама знаходзіцца ў мінусе, на ўзроўні − 681 мільёна еўра, знізіўшыся на 181,2 %. Абарот TUI таксама рэзка ўпаў у другім квартале, знізіўшыся на 10 % у параўнанні з аналагічным перыядам летась.

Сутыкнуўшыся з амаль поўным спыненнем сваёй дзейнасці з сакавіка, група выпусціла ў красавіку экстранны крэдыт на 1,8 мільярда еўра, гарантаваны нямецкай дзяржавай. Але «крэдыты павінны быць пагашаны ў вельмі кароткія тэрміны», — адзначаюць у групе.

Таму зараз рэалізуецца «глабальная праграма» са «значным скарачэннем выдаткаў», каб дзейнасць групы «магла працягвацца», нават «на аслабленым рынку», каментуе TUI.

Аднак тураператар настроены аптымістычна: «Людзі хочуць падарожнічаць» і «Еўропа паступова адкрываецца». Тут таксама лічаць, што «магчымыя летнія канікулы» з «выразнымі і адказнымі правіламі», асабліва з пункту гледжання захавання гігіены.

АРХІТЭКТУРНАЯ СПАДЧЫНА

# ЗАХАВАЦЬ ДЛЯ НАШЧАДКАЎ

## Спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА папоўніцца сталічным аб'ектам

**Цяпер вядуцца работы па ўключэнні мінскага праспекта Незалежнасці — ансамбля пасляваеннай архітэктуры — у беларускі папярэдні спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.**

Пра гэта паведаміла на прэс-канферэнцыі начальнік аддзела мастацтваў упраўлення культуры Мінгарвыканкама Наталля Смольская, паведамляе агенцтва «Мінск-Навіны».

На сёння, па яе словах, рыхтуецца праект зоны аховы. Гэта значыць, што архітэктары займаюцца дакладным вызначэннем меж праспекта і яго падрабязным апісаннем з уключэннем усіх аб'ектаў, а таксама нанясеннем атрыманай інфармацыі на ўсе неабходныя планы.

Калі казаць пра Беларусь у цэлым, то цяпер у спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА ўваходзяць Нацыянальны парк «Белавежская пушча», замкавы комплекс «Мір», архітэктурна-культурны комплекс рэзідэнцыі Радзівілаў у Нясвіжы, а таксама геадэзічнае збудаванне «Дуга Струвэ».

# Санаторыі летам будуць запоўненыя

## Беспрэцэдэнтныя зніжкі і размяшчэнне па адным у нумары. Што прапануюць айчынныя здраўніцы?

**Арганізацыі аздараўлення і санаторна-курортнага лячэння Беларусі працягвалі працаваць да канца красавіка, вядома, з захаваннем рэкамендацый Міністэрства аховы здароўя, паведаміў дырэктар Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва Генадзь БАЛБАТОЎСКІ.**

— Сёлета ў першым квартале ў параўнанні з аналагічным перыядам папярэдняга года нават атрымалі рост выручкі ад свабоднай рэалізацыі пуцёвак фізічным і юрыдычным асобам на 8 %. Па экспарце паслуг рост на 4 %, — кажа ён. — Сёння мы ўжо спынілі накіроўваць на аздараўленне ўсе катэгорыі грамадзян па нашых пуцёўках, і так будзе да стабілізацыі і паляпшэння эпідсітуацыі. Прычым па розных катэгорыях — дзецях, дарослых, якія не працуюць, і г. д. — будзем прымаць рашэнні асобна, зыходзячы з існуючых рызык.

Цяпер цэнтр перайшоў на тэрытарыяльны прынцып размеркавання пуцёвак. Як толькі сітуацыя палепшыцца, на працягу двух тыдняў з моманту прыняцця станоўчага рашэння будзе наладжана паўнавартаснае накіраванне людзей на аздараўленне па такім прынцыпе ў прыярытэтным парадку.

— Здраўніцы гатовыя і заўтра прымаць людзей. Дарэчы, там, дзе ёсць свабодная рэалізацыя, яны працягваюць прымаць адпачывальнікаў. Ёсць і людзі, якія па пуцёўках нашага цэнтра яшчэ завяршаюць курс лячэння, — адзначыў Генадзь Балбатоўскі.

Сітуацыю ў аздараўленчай сферы ён не лічыць крытычнай: працоўныя калектывы захоўваюцца, ёсць час для правядзення запланаваных рамонтаў, існуе высокая верагоднасць, што стабільную работу галіны можна будзе забяспечыць за кошт цікавасці да аздараўлення ў санаторыях з боку суайчыннікаў. Зараз назіраецца сезон летніх адпачынкаў, а пры немагчымасці нашых грамадзян выехаць для адпачынку за мяжу беларускія санаторыі цалкам могуць разлічваць на рост попыту з боку спажыўцоў.

— Так, па экспарце паказчыкі будуць нізкія. Але адзначу, што сярод расіян масавых адмоў ад браніравання на летні перыяд няма, — дадаў Генадзь Балбатоўскі. — У свабоднай рэалізацыі зараз месцы ёсць. Хоць у звычайных абставінах іх бы даўно ўжо не было. Мы кожны дзень па кожным санаторыі маніторым сітуацыю па адмовах ад браніравання. Апошні тыдзень такія выпадкі адзінкавыя. Больш за тое, апошнія два дні нават павялічылася колькасць тых, хто знаходзіцца ў санаторыях, дзякуючы свабоднай рэалізацыі. Таму пры спрыяльным развіцці сітуацыі мы разлічваем, што загрузка здраўніц у трэцім квартале складзе ў сярэднім 90 %, калі з пачатку чэрвеня пачнём актыўна працаваць.

А што па кошце? Санаторныя арганізацыі ўжо скарэктавалі свае прапановы з улікам сітуацыі: амаль паўсюдна зніжкі — як па цане самой пуцёўкі, так і на дадатковыя паслугі.

Па прагнозах дырэктара рэспубліканскага цэнтра, сярэдні кошт аднаго ложка-дня ў стандартным двухмесным нумары будзе складаць 50 рублёў (за гэтыя грошы забяспечваецца харчаванне, пражыванне і стандартнае лячэнне). Трэба сказаць, што па выніках першага квартала гэтая сума была большая — 58 рублёў. То-бок, будзе нязвыклае для летняга сезона зніжэнне.

Акрамя іншых крокаў, беларускія здраўніцы забяспечваюць усе магчымыя ва ўмовах няпростай эпідэміялагічнай сітуацыі прафілактычныя меры: гэта і тэрмаметрыя, і дэзынфекцыя, і сацыяльнае дыстанцыяванне і гэтак далей. У летні перыяд такія падыходы захаваюцца.

— Мы будзем патрабаваць іх безумоўнага выканання, — запэўніў Генадзь Балбатоўскі. — Будзем рэкамендаваць размяшчэнне па адным чалавеку ў нумары для захавання сацыяльнай дыстанцыі.

**Паводле БелТА.**

ПРАБЛЕМЫ І РАШЭННІ

# Навошта бераг турэцкі?

## Жыхары Міншчыны маюць варыянты летняга адпачынку

**Мінская вобласць валодае даволі значным турыстычным патэнцыялам. Тут налічваецца 128 гасцініц і аналагічных сродкаў размяшчэння, 157 санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацый, 42 паляўнічыя комплексы, 2246 аб'ектаў грамадскага харчавання, у тым ліку 194 грамадскага харчавання прыдарожнага сэрвісу, 891 суб'ект аграэкатурызму, 23 музеі, два тэатры, 13 цэнтраў і дамоў рамёстваў, фальклору, ткацтва. У цэнтральным рэгіёне распрацавана 442 турыстычныя, 544 экскурсійныя і 86 зялёных маршрутаў. Экскурсійным абслугоўваннем турыстаў займаюцца 94 спецыялісты, якія прайшлі атэстацыю. У тым ліку 78 экскурсаводаў і 16 гідаў-перакладчыкаў.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

> Турыстычная галіна Мінскай вобласці вымушана пераарыентавацца на ўнутраны турызм і шукаць новыя цікавыя формы работы, каб здзівіць айчынных спажыўцоў турыстычнага прадукту.

Летась былі распрацаваны новыя маршруты і праграмы. Напрыклад, «Помнікі архітэктуры Барысаўшчыны», «Гісторыі вёскі ў гісторыі краіны», у Вілейскім раёне — «Вогненнымі дарогамі Вілейшчыны», у Валожынскім раёне — «Архітэктурныя жамчужыны Івянца XIX стагоддзя», «Наш зямляк Дунін-Марцінкевіч», у Чэрвеньскім раёне сумесна з турыстычным прадпрыемствам «Віаполь» адкрыты маршрут па гарадскім пасёлку Смілавічы і музеі — «Прастора Хаіма Суціна». На базе гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Заслаўе» вяліся работы па стварэнні музея «Беларускай маляванкі». Тут устаноўлены знакі-ўказальнікі з неабходнай інфармацыяй на беларускай і англійскай мовах. Гісторыка-культурны комплекс «Лінія Сталіна» рэалізаваў новы праект «Наш браняносец», які дае магчымасць турыстам прыняць удзел у рэальным вучэбным баі. З'явіўся абласны каляндар падзейных мерапрыемстваў, які размешчаны на турыстычным партале Мінскай вобласці. Стабільна і дынамічна развіваліся медыцынскі, паляўнічы турызм, агратурызм. Па апошнім Міншчына з'яўляецца лідарам у краіне.

Цяпер сітуацыя ў сферы турызму значна пагоршылася, паколькі іншаземцы не могуць прыехаць у Беларусь з прычыны таго, што іх краіны закрылі граніцы. Турыстычная галіна Мінскай вобласці вымушана пераарыентавацца на ўнутраны турызм і шукаць новыя цікавыя формы работы, каб здзівіць айчынных спажыўцоў турыстычнага прадукту. Напрыклад, гэта добра разумее **дырэктар Маладзечанскага ТАА «Вегатур» Алена РУСАКЕВІЧ.** Сёння, каб зацікавіць людзей, неабходна стварыць новыя праекты, лічыць кіраўнік. На тэрыторыі Лагойскага раёна ёсць філіял музея «Акопы». Менавіта тут былі напісаны знакамітыя п'есы Янкі Купалы, у тым ліку і «Паўлінка». Сёлета бессмяротнаму твору спаўняецца 100 гадоў. «Вегатур» разам з літаратурным музеем Янкі Купалы прапаноўваюць рэалізаваць праект «Пасля кірмашу», які мае на мэце трохгадзінную інтэрактыўную праграму з поўным пагружэннем у атмасферу беларускага каларыту пачатку XX стагоддзя. Першая частка прадугледжвае наведванне музея «Акопы», другая — удзел у беларускім кірмашы з героямі п'есы «Паўлінка». Гасцям будзе дадзена магчымасць адчуць атмасферу народнага гуляння, наведаць карчму «Апошні грош», стаць удзельнікам беларускіх абрадаў, набыць вырабы народных умельцаў і натуральныя беларускія прадукты, паглядзець выступленні тэатральных, музыкальных і цыркавых калектываў на кірмашовай сцэне. Трэцяя частка — усіх турыстаў пасля кірмашу запрашае да сябе ў госці сям'я Крыніцкіх. Госці рассаджваюцца за сталы, частуюцца беларускімі стравамі, адначасова на сцэне ідзе спектакль па п'есе «Паўлінка».

— Гэты праект, як адзін з варыянтаў выжывання, — кажа **загадчыца сектара турызму і арганізацыйна-кадравай работы Галоўнага ўпраўлення спорту і турызму Мінаблвыканкама Інга МАЛАШКЕВІЧ.** — Для развіцця ўнутранага турызму маем на мэце актыўна рэкламаваць рэсурсы, якія ў нас ёсць, падтрымліваць лакальнае прадпрымальніцтва ў турызме, займацца прыцягненнем інвестыцый у гэтую сферу і стварэннем рэгіянальных брэндаў. Што датычыцца ўязнога турызму, у планах — прапрацаваць пытанне па бязвізавым уездзе ў Мядзельскі раён, а таксама пытанне па допуску турыстаў на прадпрыемства «Беларуськалій», дзе яны маглі б спусціцца ў шахту і паднясца на тэрыконы. Гэта дало б штуршок да распрацоўкі новых экскурсій і маршрутаў, развіццю паўднёвага напрамку ў вобласці, які не карыстаецца вялікай папулярнасцю, у тым ліку ўключыўшы Узду і Слуцк.

У санаторна-курортных і аздараўленчых установах таксама ідзе адмена браніравання пуцёвак, часткова людзі пагаджаюцца на перанос адпачынку на іншы час. Аднак большасць патрабуе вярнуць грошы. Таму санаторыі распрацоўваюць планы загрузкі. Напрыклад, санаторый «Юнацтва» для напаўнення прапаноўвае 30 % зніжкі, працуе з айчыннымі турпрадпрыемствамі па загрузцы ўстановы беларускімі грамадзянамі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

АКЦЫЯ

# Прыбяры вакол сябе



**3 панядзелка, 18 мая, стартуе традыцыйная вясенняя акцыя «Чысты вадаём». На працягу тыдня прыбярэжныя зоны рэк, азёр і вадатокаў будуць прыводзіцца ў належны выгляд.**

Як паведамілі ў «Беларускім таварыстве паляўнічых і рыбаловаў» (БТПР), якое з 2014 года выступае ініцыятарам гэтай акцыі, сёлета паўдзельнічаюць у ёй супрацоўнікі гэтага таварыства, прадстаўнікі іншых арганізацый і проста неабыякавыя грамадзяне, якія зробяць больш прывабнай тысячу кіламетраў берагавой лініі.

— Акцыя ў першую чаргу накіравана на экалагічнае выхаванне насельніцтва, прыцягненне ўвагі да праблемы забруджвання вадаёмаў, а таксама прывядзення ў парадак прыбярэжнай зоны вадаёмаў і вадатокаў напярэдадні адкрыцця сезона масавага адпачынку на свежым паветры, — паведамілі ў таварыстве.

Там адзначылі, што берагі рэк і азёр паступова становяцца больш чыстыя, бо з кожным годам колькасць сабранага смецця з аднаго кіламетра берагавой лініі змяншаецца. Так, у 2016 годзе з кіламетра берагавой лініі збіралі каля 0,83 «куба» смецця, у 2017-м — 0,78, у 2018 — 0,65. Летась на адзін кіламетр берагавой лініі прыходзілася ў сярэднім 0,63 кубаметра смецця.

Сёлета з улікам эпідэміялагічнай сітуацыі, якая складваецца ў краіне, «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў» прапануе далучыцца да акцыі рыбаловаў і ўсіх ахвотных да актыўнага адпачынку на прыродзе і сабраць смецце на берагах вадаёмаў не толькі за сабой, зразумела, а падчас свайго адпачынку паўдзельнічаць у добрай справе. Для гэтага трэба звяртацца ў раённыя арганізацыі БТПР па месцы жыхарства, дзе пры неабходнасці можна ўзяць усё неабходнае для збору смецця (пакеты, пальчаткі), а таксама атрымаць дапамогу ў вывазе сабранага смецця. Акцыя будзе доўжыцца да 24 мая.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА, фота аўтара.**

# ГАЛОЎНАЕ — НЕ ЗАБЫЦЦА НІ ПРА КОГА

## Гэтым прынцыпам кіруецца ў рабоце народны абраннік, завуч магілёўскай СШ № 34 Галіна БЯЛЯЕВА



Разам са старшынёй ТБМ Алегам ДЗЯЧКОВЫМ быў наведзены парадак на магіле ветэрана.

Фота з архіва Галіны БЯЛЯЕВАЙ.

**Не так даўно да дэпутата Магілёўскага гарсавета Галіны Бляевай паступіў сігнал, што на адных мясцовых могілках заўважана закінутае пахаванне ветэрана вайны. Нягледзячы на тое, што на тым месцы стаіць помнік і ёсць нават фотаздымак, там пачалі складзіраваць смецце. Фарба на агароджы абсыпалася, усё зарасло пустазеллем і кустоўем. Ці можна было застацца ўбаку ад ўсяго гэтага?**

— Я паралельна ўзначальваю каардынацыйны савет, куды ўваходзіць некалькі дзясяткаў грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў, мы з імі пастаянна на сувязі, — кажа Галіна. — Гэтым разам я патэлефанавала Алегу Дзячкову, які ўзначальвае ў нас у горадзе Таварыства беларускай мовы. Нас з ім яднае любоў да спадчыны і беражлівыя адносіны да культурных аб'ектаў і месцаў памяці. Мы не толькі навялі парадак на магіле і пафарбавалі агароджу, але зараз яшчэ і шукаем інфармацыю аб баявым шляху ветэрана. Магчыма, потым яшчэ і даследчую работу зробім пра жыццё і баявы подзвіг гэтага чалавека.

Наогул тэма вайны для Бяляевай архіважная. Мы ўжо пісалі пра тое, як яна стварыла са сваімі памочнікамі са школы электронную інтэрактыўную карту па абароне Магілёва. Цяпер карта ўдакладняецца і абнаўляецца. Гэты праект настаўніца гісторыі рэалізуе разам з гарвыканкамам і абласным пошукавым клубам «ВІККРУ». Карта стане больш насычанай, інфармацыйнай і максімальна дакладнай на цяперашні час. Да яе зробяць базу даных, якая будзе складацца з больш чым пяці тысяч новых імёнаў абаронцаў Дняпроўскага рубяжа, устаноўленых апошнім часам пошукавікамі і іх нязменным кіраўніком Мікалаем Барысенкам.

Суразмоўніца кажа, што ёй вельмі дапамагае вопыт, атрыманы пры напісанні кнігі «Кастрычніцкі раён горада Магілёва 1962—2019 гады» ў суаўтарстве з Віктарам Клімковічам і Казімірам Сяліцкім. Работа працягвалася два гады і завяршылася ў канцы мінулага года. У кнігу ўвайшла гісторыя стварэння раёна, інфармацыя пра тых людзей, якія стаялі каля яго вытокаў. Эканоміка, культура, ахова здароўя, спорт і гэтак далей — усё гэта паслядоўна выкладзена на 160 старонках. Свайго роду летапіс роднага раёна. Памяць пра тых, хто займаўся яго развіццём.

### МАСКІ, ПІЦЫ, АБЕДЫ...

Вельмі шмат што залежыць ад чалавека з арганізатарскімі здольнасцямі, асабліва ў гэты эпідэміялагічна неспрыяльны час. Актыўная дэпутатка паспела паўдзельнічаць і ў забеспячэнні медыкаў маскамі. Яна не пакінула без увагі заклік начальніка аддзела па адукацыі адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Таццяны Кандрацьевай падтрымаць гэты працэс,данесла прапанову да калег па сваёй школе. На той момант яшчэ ішлі канікулы і можна было прысвяціць важнай справе некалькі гадзін свайго часу. Нехта шыў маскі дома, нехта непасрэдна ў школе. Усяго толькі адной 34-й школай было зроблена каля 900 масак для Магілёўскай бальніцы № 1.

Пра дабрачынныя абеды кавярні Мяса&Лаваш мы ўжо таксама пісалі. Галіна Бяляева, дарэчы, мае да іх дачыненне. Яна мабілізавала сваіх знаёмых, калег, дэпутатаў, і ўсе яны падтрымалі добрыя пачынанні прадуктамі. Сабралі і перадалі некалькі мяхоў бульбы, гародніну, купілі мяса. А хутка да акцыі далучацца яшчэ тры школы, з кіраўніцтвам якіх Галіна ўжо правяла перамовы. А яшчэ яна дапамагла магілёўскай кавярні «Пармезан» зрабіць добры жэст і падтрымаць працу медыкаў смачнымі піцамі. Яна высветліла, што часцей за ўсё гарачымі абедамі дапамагаюць непасрэдна тым, хто займаецца лячэннем, а вось брыгады, якія прынялі выклік і давезлі хворага да месца прызначэння, часта застаюцца па-за межамі ўвагі. Дэпутатка тут жа правяла перамовы з галоўным урачом Магілёўскай гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі Сяргеем Карунным і высветліла, хто больш за ўсіх загружаны і каму лепш адрасаваць дапамогу. Кавярня «Пармезан» за свой кошт на працягу амаль тыдня забяспечвала медыцынскія брыгады смачнымі піцамі і гэтым падымала работнікам настрой.

— Я проста кіруюся тымі запытамі, якія да мяне паступаюць, — сціпла кажа пра ўсе гэтыя дабрачынныя справы Галіна. — Насамрэч добрых і спагадлівых людзей шмат. Але яны не заўсёды ведаюць, як дапамагчы. І я бяру арганізацыйныя пытанні на сябе — тэлефаную, каардыную, кантралюю працэс. Супакойваюся толькі тады, калі мэта дасягнутая.

### ТОЛЬКІ ТАДЫ ЦЯБЕ БУДУЦЬ ВЕДАЦЬ У ТВАР

— Фізічна я не магу пазнаёміцца з кожным, хто за мяне прагаласаваў, бо гэта амаль шэсць тысяч жыхароў маёй акругі. Але я адсочваю тых, хто да мяне звярнуўся, — кажа Галіна. — Калі гэта пенсіянеры, я ім патэлефаную нават пасля таго, як іх праблемы вырашыліся. Мне трэба ведаць, што яны не адзінокія, што ў іх ёсць памочнікі, якія і ў краму сходзяць, і лекі прынясуць. Вядома, лягчэй працаваць, калі ў доме жыве актыўны чалавек, які ў курсе праблем усіх жыхароў. Ён заўсёды праінфармуе, падкажа. Галоўнае, каб ён жыў грамадскімі інтарэсамі, а не толькі сваімі. Плённая работа вядзецца з прафсаюзамі, Беларускім саюзам жанчын, «Белай Руссю», членам якіх я з'яўляюся. Разам ладзяцца сумесныя акцыі, робяцца добрыя справы. Потым я рассылаю справаздачы калегам па школах. А можа нехта таксама падтрымае?

Напярэдадні Дня Вялікай Перамогі народная абранніца разам з дэпутатам гарсавета Людмілай Ільінскай арганізавала прыборку месца абароны Магілёва — супрацьтанкавага рова ў Казіміраўцы. Усе думалі, што гэта проста канава і засыпалі яе розным смеццем. Да акцыі далучыліся камунальнікі, пошукавікі клуба «ВІККРУ» і магіляўчане, якім таксама не абыякавы лёс роднага горада.

— Толькі сваім прыкладам можна кагосьці зацікавіць і падахвоціць да дзеянняў, — лічыць суразмоўніца. — Гэта асабліва важна, калі справа датычыцца памяці. Ёсць тыя, каму мы абавязаны жыццём, краінай, нашым агульным будучым. І пра гэта мы абавязкова павінны памятаць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

❍ У тэму

## Каб быць незалежнымі, трэба памятаць

«Сцяна Памяці» ў Вендаражскім дзіцячым садзе — сярэдняй школе з фотаздымкамі тутэйшых ураджэнцаў-франтавікоў, курган Славы ў вёсцы Дубінка, дзе 18 лютага 1943 года карнікі спалілі 186 мірных жыхароў, мемарыял у вёсцы Благавічы, дзе ў брацкай магіле ляжаць загінулыя ў няроўным баі пры абароне студэнты Магілёўскага педынстытута — байцы камсамольскага знішчальнага батальёна. Воінскае пахаванне каля вёскі Дашкаўка: тут у адной магіле з усімі пахаваны 19-гадовы узбек кулямётчык Шадзі Шаімаў, які пасмяротна атрымаў ордэн Леніна і Залатую Зорку за подзвіг пры вызваленні раёна ў ліпені 44-га — усе гэтыя памятныя мясціны Магілёўскага і Чавускага раёнаў наведаў у перадсвяточныя майскія дні **член Савета Рэспублікі, прарэктар МДУ імя А. Куляшова Алег ДЗЯЧЭНКА,** каб разам са сваімі выбаршчыкамі і прадстаўнікамі мясцовай улады аддаць даніну павагі ўсім тым, хто не вярнуўся з вайны.

— Маральны абавязак кожнага — заўсёды памятаць пра гэтыя і тысячы іншых трагедый Вялікай Айчыннай вайны, — адзначыў ён падчас мітынгу каля мемарыяла ў вёсцы Благавічы. — Памяць пра нашых землякоў, якія зрабілі неацэнны ўклад у перамогу савецкага народа над фашызмам, не гасне з гадамі — яна перадаецца з пакалення ў пакаленне, дапамагае выстаяць у любых выпрабаваннях, натхняе на новыя здзяйсненні, прымушае яшчэ больш цаніць і абараняць суверэнітэт, незалежнасць і тэрытарыяльную цэласнасць Беларусі.


## ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ ЗА 1-й КВАРТАЛ 2020 ГОДА

**ООО «Темпл Сити»**

**220012, г. Минск, пр-т Независимости, 95/1, комн. 7, УНП 192280260**
Вид экономической деятельности: **сдача внаем собственного и арендуемого имущества**
Единица измерения: **тыс. руб.**

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 марта 2020 года

| АКТИВЫ | Код строки | На 31 марта 2020 года | На 31 декабря 2019 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 7 533 | 7 571 |
| Нематериальные активы | 120 | 1 | - |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | - | - |
| в том числе: | | | |
| инвестиционная недвижимость | 131 | - | - |
| предметы финансовой аренды (лизинга) | 132 | - | - |
| прочие доходные вложения в материальные активы | 133 | - | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 13 | 13 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 16 | 15 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | - | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | - | - |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | 4 | 4 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **7 567** | **7 603** |
| **II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 13 | 13 |
| в том числе: | | | |
| материалы | 211 | 13 | 13 |
| животные на выращивании и откорме | 212 | - | - |
| незавершенное производство | 213 | - | - |
| готовая продукция и товары | 214 | - | - |
| товары отгруженные | 215 | - | - |
| прочие запасы | 216 | - | - |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | - | - |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | - | - |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 92 | 87 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | 171 | 341 |
| Денежные средства и эквиваленты денежных средств | 270 | 65 | 13 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | - | - |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **341** | **454** |
| **БАЛАНС** | **300** | **7 908** | **8 057** |

| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | Код строки | На 31 марта 2020 года | На 31 декабря 2019 года |
|---|---|---|---|
| **III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный капитал | 410 | 3 383 | 3 383 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - | - |
| Резервный капитал | 440 | - | - |
| Добавочный капитал | 450 | - | - |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | (1 509) | (1 509) |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | (792) | - |
| Целевое финансирование | 480 | - | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **1 082** | **1 874** |
| **IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 5 293 | 4 420 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | - | - |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | 912 | 1 245 |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **6 205** | **5 665** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | - | - |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | 546 | 446 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 75 | 72 |
| в том числе: | | | |
| поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 6 | 8 |
| по авансам полученным | 632 | 16 | 13 |
| по налогам и сборам | 633 | 17 | 14 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 1 | 1 |
| по оплате труда | 635 | 2 | 2 |
| по лизинговым платежам | 636 | - | - |
| собственнику имущества (учредителям, участникам) | 637 | - | - |
| прочим кредиторам | 638 | 33 | 34 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | - | - |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | - | - |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **621** | **518** |
| **БАЛАНС** | **700** | **7 908** | **8 057** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – март 2020 года

| Наименование показателей | Код строки | За январь–март 2019 года | За январь–март 2018 года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 298 | 243 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | - | - |
| Валовая прибыль | 030 | 298 | 243 |
| Управленческие расходы | 040 | (108) | (70) |
| Расходы на реализацию | 050 | - | - |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 060 | 190 | 173 |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 321 | 2 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (153) | (7) |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | 358 | 168 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 1 | 5 |
| в том числе: | | | |
| доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | - | - |
| доходы от участия в уставном капитале других организаций | 102 | - | - |
| проценты к получению | 103 | 1 | 1 |
| прочие доходы по инвестиционной деятельности | 104 | - | 4 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | - | (2) |
| в том числе: | | | |
| расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 111 | - | - |
| прочие расходы по инвестиционной деятельности | 112 | - | (2) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | 27 | 160 |
| в том числе: | | | |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 121 | 27 | 160 |
| прочие доходы по финансовой деятельности | 122 | - | - |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (1 178) | (75) |
| в том числе: | | | |
| проценты к уплате | 131 | (75) | (73) |
| курсовые разницы от пересчета активов и обязательств | 132 | (1 103) | (1) |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | - | (1) |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | 140 | (1 150) | 88 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | (792) | 256 |
| Налог на прибыль | 160 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | - | - |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | - | - |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | (792) | 256 |
| Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 220 | - | - |
| Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток) | 230 | - | - |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | (792) | 256 |
| Базовая прибыль (убыток) на акцию | 250 | - | - |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию | 260 | - | - |

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ**

**ЛОТ 1**

- капитальное строение, инв. № 411/С-13813 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), площадью 191,0 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Дзержинского, 58.

Лот 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 420455100001001167, (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли (обслуживания здания магазина), площадью 0,1022 га, расположенном по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Дзержинского, 58. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах линий электропередачи, площадь 0,0134 га

Начальная цена продажи – 9 888 руб.
(девять тысяч восемьсот восемьдесят восемь рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 988 р. (девятьсот восемьдесят восемь рублей)

**ЛОТ 2**

- капитальное строение, инв. № 411/С-15726 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака 2 25 01, наименование – квасильно-засолочный цех), площадью 80,4 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Ленина, 21А.
- сооружение, инв. № 411/С-15762 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства 3 10 00, наименование – наружная сеть канализации), протяженностью 14,4 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Ленина, 21А.

Лот 2 расположен на земельном участке, кадастровый номер 420455100001001330, (назначение – земельный участок для размещения объектов оптовой торговли, материально-технического и продовольственного снабжения, заготовок и сбыта продукции 1 16 06 (обслуживания здания квасильно-засолочного цеха), площадью 0,0517 га, расположенном по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Ленина, 21А

Начальная цена продажи – 3 031,20 руб.
(три тысячи тридцать один рубль двадцать копеек) с учетом НДС.
Сумма задатка – 303 руб. (триста три рубля)

**ЛОТ № 3**

- капитальное строение, инвентарный номер 411/С – 14795, (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки и табака 2 25 01, наименование – колбасный цех), площадью – 407,5 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Октябрьская, 32.
- капитальное строение, инвентарный номер 411/С – 14796, (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально – технического снабжения, хранилищ 2 29 08, наименование – склад), площадью – 70,8 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Октябрьская, 32/1.
- капитальное строение, инвентарный номер 411/С – 14797, (назначение – здание специализированное иного назначения 2 29 00, наименование – насосная), площадью – 3,9 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Октябрьская, 32/2.
- капитальное строение, инвентарный номером 411/С – 14798, (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ 2 29 08, наименование – склад), площадью – 11,8 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Октябрьская, 32/3.

Лот 3 расположен на земельном участке, кадастровый номер 420455100001001155, (назначение – земельный участок для размещения объектов оптовой торговли, материально-технического и продовольственного снабжения, заготовок и сбыта продукции 1 16 06 (обслуживания зданий насосной, колбасного цеха и двух складов), площадью 0,1803 га, расположенном по адресу: г. п. Большая Берестовица, ул. Октябрьская, 32. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в водоохранных зонах водных объектов, площадь 0,1803 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах линий электропередачи, площадь 0,0432 га

Начальная цена продажи – 10 212 руб.
(десять тысяч двести двенадцать рублей) с учетом НДС.
Сумма задатка – 1 021 руб. (одна тысяча двадцать один рубль)

**Продавец – Берестовицкий филиал Гродненского областного потребительского общества, 231778, г. п. Берестовица, ул. Советская, 2, тел. 8-01511-750-90**

**Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70, 55-87-71**

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 18 июня 2020 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержится на сайте организатора аукциона **https://grino.by/aukcion.**

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 13.12.2019 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.

**Последний день приема заявлений – 16 июня 2020 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71–
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
https://grino.by/aukcion**



**ИЗВЕЩЕНИЕ О СНЯТИИ ОБЪЕКТОВ С ТОРГОВ**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) сообщает о снятии с аукциона, назначенного на **25.05.2020, деревообрабатывающего цеха с инв. № 610/С-14301, расположенного по адресу: Минская область, Борисовский район, Бродовский с/с, д. Бродовка,** ОАО «Борисовский завод «Автогидроусилитель».

Извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 22.04.2020.

УНП 600009233


НА СЛЫХУ

# ДАПАМОГА ПОБАЧ

**У Гомельскай вобласці грамадскія інспектары па ахове працы ва ўстановах адукацыі рэгулярна кантралююць наяўнасць супрацоўнікаў сродкаў аховы супраць распаўсюджвання віруснай інфекцыі. Інфармацыя аб сітуацыі на месцах накіроўваецца штодня ў Гомельскі абласны прафкамітэт, што дазваляе аператыўна вырашаць пытанні, якія ўзнікаюць.**



Такім чынам Гомельская абласная арганізацыя Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі ўключылася ў маштабную работу, якая вядзецца ў краіне па прафілактыцы каранавіруса. Па словах **намесніка старшыні гэтай арганізацыі Наталлі ДАВЫДЕНКІ,** у красавіку гэтага года каля ста тысяч рублёў з фонду дапамогі было накіравана на набыццё прадметаў індывідуальнай аховы супрацоўнікаў галіны:

— Акрамя таго прафсаюзнымі арганізацыямі вобласці закуплена сродкаў індывідуальнай аховы на суму больш за 50 тысяч рублёў. Матэрыяльная дапамога аказана больш чым 700 супрацоўнікам галіны на суму каля 40 тысяч рублёў.



Раённыя прафкамы ва ўсіх райцэнтрах вобласці і Гомеля актыўна падтрымалі членаў сваіх прафсаюзаў: забяспечылі маскамі, пальчаткамі, сродкамі дэзынфекцыі.

— Між тым педагагічны калектыў гімназіі № 10 Гомеля не застаўся абыякавы ў перыяд пандэміі да праблем медыцынскіх работнікаў, — адзначыла суразмоўніца. — Аказаць дапамогу вырашылі калектыўна. Сабралі сродкі, звязаліся з галоўным урачом Гомельскай сухотнай бальніцы, удакладнілі, чым могуць дапамагчы. Высветлілася, што не хапае апырскавальнікаў для правядзення дэзынфекцыі. 25 камплектаў былі закуплены і перададзены ў лячэбную ўстанову.

Чачэрская раённая арганізацыя прафсаюза адукацыі і навукі ўзяла шэфства над педагогамі-ветэранамі сярэдняй школы № 2 Чачэрска. Пажылыя цяпер імкнуцца без крайняй неабходнасці не выходзіць з дому ў месцы масавага знаходжання людзей.

Захоўваючы ўсе неабходныя санітарныя меры і сацыяльную дыстанцыю, адбываецца дастаўка неабходных прадуктаў харчавання і медыкаментаў ветэранам працы, якія знаходзяцца на самаізаляцыі. Такую ініцыятыву рэалізуюць валанцёры прафсаюзнага атрада «Добрае сэрца» Мазырскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа. Таксама яны дапамагаюць у дастаўцы медыкаментаў і прадуктаў харчавання ўсім састарэлым людзям свайго горада.

Прафсаюзны камітэт студэнтаў Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны для папулярызацыі нашэння павязак і павышэння ўвагі студэнтаў да выканання правілаў бяспекі ў сеціве запусціў флэшмоб #улыбнисьглазамиchallenge.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота дадзена Гомельскай абласной арганізацыяй Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.**

У ТЭМУ

# Асацыяцыя — медыкам

**Магілёўскія дэпутаты таксама далучыліся да дабрачыннай традыцыі дапамагаць медыкам. Яны перадалі пяці бальніцам вобласці 22 тысячы рублёў.**

— Усё пачалося з ініцыятывы старшыні Бабруйскага гарсавета дэпутатаў Міхаіла Жалудова дапамагчы медыкам, — кажа **старшыня Магілёўскай абласной асацыяцыі Саветаў мясцовых дэпутатаў Анатоль МАЦЮЛІН.** — У спіс спачатку трапілі тры ўстановы — Бабруйская цэнтральная бальніца, а таксама магілёўскія — інфекцыйная і № 1. Потым яшчэ ўключылі сюды Круглянскую і Чавускую. Грошы выдзелілі для падтрымкі бяспекі медработнікаў. Гэта тыя людзі, якія павінны заставацца ў страі і аказваць дапамогу насельніцтву. З улікам таго, што грошы на гэта ні ў якім бюджэце не былі запланаваны, кожная капейка будзе дарэчы.

Анатоль Мацюлін паведаміў, што сёння дэпутаты выкарыстоўваюць новыя формы работы — дыстанцыйныя. Прыйшлося крыху абмежаваць дзейнасць органаў мясцовага самакіравання, звязаную з правядзеннем масавых мерапрыемстваў. Зараз увага ўдзяляецца больш індывідуальным стасункам. Нядаўна на невялікім пасяджэнні дэпутаты абмеркавалі, як наладжана сістэма ўзаемадзеяння з органамі мясцовага самакіравання.

— Мы стараемся вырашаць пытанні праз нашых старастаў і вулічкамаў, каб людзі менш паяўляліся ў грамадскіх месцах, — кажа Анатоль Мацюлін. — Але на сяле работа дастаўкі добра была наладжана і раней. І сёння людзі часцей звяртаюцца па дапамогу да блізкіх або сацработнікаў. Шкада, што не ўсе з іх правільна ацэньваюць небяспеку. Часцей за ўсё менавіта праз чалавечую бестурботнасць і расце лічба хворых на COVID.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**


МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

**www.zviazda.by**

**e-mail: info@zviazda.by** (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 14 мая 2020 года.**